ВЕЧНА ЖЫВЫ

З Уладзімірам Ільічом Леніным я пазнаёміўся ў Швейцарыі восенню 1904 года ў адным з памяшканняў, дзе звычайна збіраліся эмігранты-бальшавікі. Уваходжу, шукаю вачыма Леніна па апісаннях таварышаў... Вось ён! Сядзіць у кутку; пад электрычнай лямпачкай блішчыць яго велізарны лоб; абапёршыся локцем на стол, прыставіў да лба далонь і паглядвае з усмешкай на прыбываючых, пастукваючы алоўкам.

Таварышы падыходзілі да Уладзіміра Ільіча, папросту віталіся, гутарылі. Хутка пачаўся яго даклад. Уражанне ад першай сустрэчы было незабыўнае.

— Вось гэта сапраўды правадыр партыі і разам з тым такі просты таварыш, да якога можна пайсці і выкласці ўсё, што ёсць на душы! — так гаварыў я сабе.

У дні разгортваючыхся рэвалюцыйных падзей у Расіі Уладзімір Ільіч станавіўся нейкім асабліва сабраным, мэтанакіраваным і яго геніяльная празорлівасць абвастралася да крайнасці, праяўлялася з усёй паўнатой. Ён дакладна вызначаў расстаноўку класавых сіл у краіне і тыя мэты, да якіх імкнуўся кожны клас, беспамылкова намячаў палітыку і тактыку партыі.

Ужо ў першыя дні Лютаўскай рэвалюцыі Уладзімір Ільіч прадугледжваў у недалёкім будучым звяржэнне буржуазнага ўрада і ўказаў партыі на неабходнасць рыхтавацца да гэтага.

Палітычная зоркасць і рэвалюцыйная вытрымка дапамаглі яму вырвацца са швейцарскай пасткі. 27 сакавіка 1917 года Уладзімір Ільіч выехаў са Швейцарыі ў Расію. А ўжо 3 красавіка позна вечарам рэвалюцыйныя рабочыя Петраграда з энтузіязмам сустракалі свайго правадыра, слухалі на плошчы яго прамову з заклікам да барацьбы за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі.

Чым далей у мінулае ўходзяць ад нас незабыўныя дні першых год рэвалюцыі, тым велічней, ярчэй і цяплей ажывае перад намі светлы вобраз Леніна, геніяльнага правадыра пралетарыяту, найглыбейшага мысліцеля, найвялікшага рэвалюцыянера, чалавека незвычайна высокіх душэўных якасцей.

Ленін належыць усяму свету, але перш за ўсё ён наш народны геній. Яго жыццё — гэта вялікі і непараўнальны подзвіг, натхняючы прыклад самаадданага служэння рабочаму класу, усім працоўным.

Калі маладая Савецкая рэспубліка толькі распачынала мірнае сацыялістычнае будаўніцтва, Уладзімір Ільіч з горыччу гаварыў аб адсталасці эканомікі нашай краіны, аб тым, што на велізарных яе прасторах пануе патрыярхальшчына, паўдзікасць і самая сапраўдная дзікасць. Ён заклікаў працоўных напружыць усе сілы, збіраць камень за каменем, каб стварыць трывалы фундамент сацыялістычнага грамадства.

«У нас, — гаварыў Уладзімір Ільіч, — ёсць матэрыял і ў прыродных багаццях, і ў запасе чалавечых сіл, і ў цудоўным размаху, які дала народнай творчасці вялікая рэвалюцыя, — каб стварыць сапраўды магутную і багатую Русь».

Яшчэ тады, калі краіна была разарона, Уладзімір Ільіч прадбачыў вялікую будучыню нашай Радзімы, гіганцкі рост яе эканамічнай, палітычнай і ваеннай магутнасці, рост творчых сіл народа, росквіт навукі і мастацтва, перамогу сацыялізма.

І ленінскія прадбачанні, яго навукова абгрунтаваны план пабудовы сацыялізма і камунізма, яго высакародныя ідэалы былі ажыццёўлены

(Заканчэнне на 4-й стар.)

ГОЛАС РАДЗІМЫ

№ 7—8 (792—793)
Студзень 1964 г.
Цана 2 кап.

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАЙ СЕКЦЫІ САВЕЦКАГА КАМІТЭТА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ

Мал. народнага мастака СССР Н. Жукава.

Камюніке дружбы і адзінства

У савецкім друку апублікавана савецка-кубінскае камюніке аб знаходжанні прэм'ер-міністра Рэвалюцыйнага ўрада Рэспублікі Куба Фідэля Кастра ў СССР. У ім указваецца, што Фідэль Кастра меў сустрэчы і гутаркі з М. С. Хрушчовым і іншымі кіраўнікамі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, у час якіх адбыўся абмен думкамі па розных пытаннях, што цікавяць абодва бакі.

У камюніке падкрэсліваецца, што СССР і Куба і ў далейшым будуць выступаць за ўсеагульнае і поўнае раззбраенне, за хутчэйшае вырашэнне праблемы германскага мірнага ўрэгулявання, за развіццё раўнапраўнага міжнароднага супрацоўніцтва паміж усімі дзяржавамі.

Фідэль Кастра, як адзначае камюніке, зноў падкрэсліў, што Куба жадала і жадае трывалага міру ў раёне Карыбскага мора і гатова зрабіць усё неабходнае для ўстанаўлення добрасуседскіх адносін з ЗША. Са свайго боку М. С. Хрушчоў заявіў аб поўнай падтрымцы гэтага курса Рэспублікі Куба з боку Савецкага ўрада.

У заключнай частцы камюніке гаворыцца, што ЦК КПСС і Нацыянальнае кіраўніцтва Адзінай партыі сацыялістычнай рэвалюцыі застаюцца вернымі рашэнням міжнародных Маскоўскіх нарад камуністычных і рабочых партый 1957 і 1960 гадоў і будуць паслядоўна працягваць барацьбу за ўмацаванне ўсіх краін сацыялістычнай садружнасці.

У Маскве таксама падпісана доўгатэрміновае пагадненне аб пастаўках цукру ў СССР з Рэспублікі Куба. На працягу 1965 — 1970 гадоў Савецкі Саюз закупіць яго 24,1 мільёна тон. Як падкрэсліваецца ў пагадненні, цэны на цукар-сырэц будуць пастаяннымі, што дасць магчымасць Рэспубліцы Куба планава развіваць сваю эканоміку.

У нумары:

С. Скарапанаў:

ЗЯМЛЯ СТАЛА КАРМІЛІЦАЙ 2 ст.

Е. Кумарасвамі:

ПРАЎДА АБ САВЕЦКАЙ НАФЦЕ 2 ст.

НАШЫ ВЁСКІ І ГАРАДЫ 3 ст.

В. Гайле:

НА РАЗДАРОЖЖЫ 4—5 ст.

Пауль Трунк:

ПЕРАД СУДОМ — ЗАБОЙЦЫ 6 ст.

С. Клімковіч, Т. Рэутовіч:

ПЛАН «ОСТ» І БЕЛАРУСКІЯ НАЦЫЯНАЛІСТЫ 7 ст.

А. Марскоў:

ШУКАЛЬНІКІ СКАРБАЎ І СКАРБЫ 8 ст.

ЯКІ РАЗМАХ!

З вялікім задавальненнем і радасцю прачытаў у газеце «Голас Радзімы» даклад М. С. Хрушчова на Пленуме ЦК КПСС. Які размах, якія каласальныя сумы адпушчаны на стварэнне вялікай хіміі! Хімічная прамысловасць дасць сельскай гаспадарцы зброю для паспяховай барацьбы са шкоднікамі і засухай, гарантуе высокія і ўстойлівыя ўраджаі.

Хуткае развіццё хімічнай прамысловасці дасць Савецкаму народу яшчэ большыя магчымасці для далейшага ўздыму народнай гаспадаркі краіны. Які б паклёп ні ўзводзілі ворагі нашай Радзімы, яны павінны прызнаць, што СССР з поспехам працягвае мірнае будаўніцтва на карысць і працвітанне народаў. І ўсё гаворыць аб тым, што праграма намечанага будаўніцтва будзе паспяхова выканана без пабочнай дапамогі

Хачу падзяліцца з вамі радасцю, якую мы, жыхары Ліёна, перажылі нядаўна. Мая жонка кажа, ды і не адна яна, а ўсе французы гавораць так, што ўбачанае і пачутае імі на канцэрце застанецца ў іх памяці на ўсё жыццё. Мы глядзелі канцэрт Чырванасцяжнага ансамбля песні і танца пад кіраўніцтвам Барыса Аляксандрава.

Канцэрт адбываўся ў новым палацы спорту, дзе прысутнічала каля 16 тысяч гледачоў. Поспех быў каласальны. Немагчыма было прытрымлівацца намечанай праграмы, таму што большасць нумароў патрабавала паўтору. Такое высокае майстэрства ў спевах і танцах ліёнцы чулі і бачылі ў першы раз.

Усё гэта гаворыць за тое, што і ў эканоміцы і ў культуры Савецкі Саюз ідзе гіганцкімі крокамі наперад.

І. СІНЯЎСКІ.

Францыя.

ПІШУЦЬ ЗЕМЛЯКІ

НА ЗДЫМКАХ: 1. Будуецца новы санаторый на 250 месц у Ждановічах пад Мінскам. Тут знойдзены мінеральныя крыніцы, воды якіх сваімі лячэбнымі якасцямі не ўступаюць мінеральным водам Трускаўца. 2. Працуе над новымі песнямі адзін з папулярнейшых беларускіх кампазітараў Юрый Семяняка. 3. Багаты залежамі вапны кар'ер ля вёскі Загор'е Навагрудскага раёна. Адсюль механізатары дастаўляюць каштоўны мінерал у бліжэйшыя калгасы. 4. Кандыдат тэхнічных навук Ігар Ярмоленка ў сябе ў лабараторыі. Вучоныя АН БССР уносяць дастойны ўклад у развіццё хімічнай прамысловасці рэспублікі.

БУДНІ СЯМІГОДКІ



БУДНІ СЯМІГОДКІ

На Брэсцкім заводзе «Газаапарат» запушчан новы канвеер па зборцы газавых пліт. У гэтым годзе прадпрыемства выпусціць 122 тысячы пліт.

Студэнтка вячэрняга аддзялення агульнатэхнічнага факультэта Мінскага політэхнічнага інстытута, токар Мінскага аўтазавода Алена КАРЧЭУСКАЯ.

Ва ўсе куткі краіны адпраўляецца прадукцыя Мінскага аўтамабільнага завода.

Лячэбныя і прафілактычныя прэпараты для народнай гаспадаркі краіны выпускае Віцебская біяфабрыка. НА ЗДЫМКУ: у аўтаклаўнай фабрыцы. Начальнік цэха Д. РЫЖКОЎ (злева) і аўтаклавер М. ХАДУКОЎ правяраюць якасць растураў для вырабу прэпаратаў.

ПРАЎДА

ВІЦЭ-ПРЭЗІДЭНТ ДЗЯРЖАЎНАЙ НАФТАВАЙ КАРПАРАЦЫІ ЦЭЙЛОНА Е. КУМАРАСВАМІ АБ РАСТУЧАЙ РОЛІ СССР НА СУСВЕТНЫМ РЫНКУ НАФТЫ І ХАРАКТАРЫ САВЕЦКАЙ ГАНДЛЕВАЙ ПАЛІТЫКІ.

«ТРЫБЮН», КАЛОМБА.

У апошні час мы чуем столькі крыватолкаў аб савецкай нафце, што час расказаць праўду аб тым, што толькі дзякуючы Савецкаму Саюзу і савецкай нафце аказалася магчымым пакласці канец шматгадовай эксплуатацыі замежнымі нафтавымі кампаніямі цэлага раду краін.

Савецкі Саюз, асабліва ў пасляваенныя гады, з'явіўся магутным фактарам, які стымулюе вызваленне ад іншаземнай залежнасці раду краін як здабываючых, так і спажываючых нафту.

ГЭТА ВЫГАДНА. ЧАМУ?

Савецкі Саюз запланаваў к 1965 году здабываць 230—240 мільёнаў тон нафты ў год. Пры гэтым трэба ўлічыць, што Савецкая краіна з году ў год перавыконвае намечаныя планы. К 1972 году Савецкі Саюз дагоніць ЗША, калі вытворчасць нафты ў Амерыцы будзе развівацца цяперашнімі тэмпамі. Велізарныя поспехі ў развіцці тэхнікі—залог таго, што савецкі народ дасягне намечанай мэты.

Умовы, на якіх рускія прадаюць нафту, вельмі ўзбуджаюць нафтавыя кампаніі. Савецкі Саюз згадзіўся праводзіць разлікі са слабаразвітымі краінамі таварамі. Ён атрымлівае ў якасці плацяжоў кофе з Бразіліі, цукар з Кубы, каўчук і чай з Цэйлона, рыбу ад Ісландыі, какао з Ганы. Дзякуючы такому тавараабмену краіны, якія купляюць савецкую нафту, пазбегнулі доларавай пасткі.

У 1960 годзе Савецкі Саюз заключыў кантракт на пастаўку ў Індыю газы і дызельнага паліва. Індыя перажывала вострую патрэбу ў нафтавых прадуктах і была даходным рынкам для кампаній «Бірма-Шэл», «Станвак» і «Калтэкс», якія прадавалі сваю прадукцыю па сусветных картэльных цэнах. Такі гандаль ствараў для Індыі сур'ёзныя фінансавыя цяжкасці.

Былы міністр нафтавай і горнаруднай прамысловасці Індыі Малавія звярнуўся да нафтавых кампаній з просьбай перапрацоўваць савецкую нафту. Прыйшоў адказ. Індыйскі ўрад пачаў закупку ў Савецкім Саюзе газы і дызельнага паліва. Пастаўкі гэтай прадукцыі ажыццяўляліся праз Індыйскую нафтавую кампанію, прычым плацяжы праводзіліся ў рупіях, а не ў фунтах стэрлінгаў. Эканоміка Індыі была выратавана дзякуючы аплаце савецкай нафты ў рупіях і шляхам тавараабмену.

Замежныя нафтавыя кампаніі на старонках свайго друкаванага органа «Інтэрнейшнл ойлмен» называюць дзейнасць Савецкага Саюза ў галіне гандлю нафтай «распаўсюджаннем эканамічнага хаосу шляхам падрыву нафтавых аперацый». Гэта яўна тэндэнцыйная ацэнка дзейнасці Савецкага Саюза, які, магчыма, і падрывае манаполію нафтавых кампаній Захаду, але затое з'яўляецца стабілізуючым фактарам для эканомікі развіваючыхся краін.

Вельмі важна аб'ектыўна разабрацца ў тым, якую ролю ў сапраўднасці адыгрывае савецкая нафта ў вызваленні Цэйлона ад панавання міжнароднага нафтавага картэля. У жніўні 1960 года замежныя кампаніі выступілі супраць павелічэння таможаных пошлін на нафту і нафтапрадукты, спасылаючыся на эканамічную мэтазгоднасць такога кроку. Аднак, калі прымаўся закон аб стварэнні Дзяржаўнай нафтавай карпарацыі Цэйлона, тыя ж самыя кампаніі пачалі выстаўляць прэтэнзіі, крытыкуючы ўвядзенне мінімальных цэн як несумленны прыём.

Такім чынам, асноўная прычына стварэння Дзяржаўнай нафтавай карпарацыі ляжыць перш за ўсё ў адказе замежных кампаній знізіць цэны на нафтапрадукты.

АДЛІГА НА СУСВЕТНЫМ РЫНКУ

Савецкі Саюз аказвае вялікую дапамогу і іншым краінам, якія імкнуцца вырвацца з кіпцюроў міжнароднага нафтавага картэля. Экспарт савецкай нафты няспынна расце.

Цяпер, калі пастаўкі савецкай нафты праводзяцца ва ўсе куткі зямнога шара, нафтавы картэль забіў трывогу. У ход пушчана ўсё, каб зганьбіць савецкую нафту. Амерыканская ж дапамога Цэйлону была наогул спынена ў лютым 1963 года. Для нафтавых магнатаў ЗША пастаўкі савецкай нафты ў шырокіх маштабах аказаліся такім жа непрыемным сюрпрызам, як першы рускі спадарожнік для дзяржаўнага дэпартамента.

У выніку з'яўлення на міжнародным рынку савецкай нафты і націску, аказваемаму на нафтавы картэль нацыянальнымі кампаніямі, змяніліся цэны на нафту і нафтапрадукты, якія заставаліся штучна замарожанымі на працягу трох дзесяткаў гадоў. Іншымі словамі, рускі экспарт

ЗЯМЛЯ СТАЛА КАРМІЛІЦАЙ

Міністр сельскай гаспадаркі БССР С. СКАРАПАНАЎ расказвае:

Да рэвалюцыі Беларусь належала да ліку адсталых ускраін царскай Расіі. Беларускае сялянства бязлітасна эксплуатавалася памешчыкамі і капіталістамі. Чатыры тысячы памешчыкаў валодалі 66,5 працэнта ўсёй зямлі, тады як на долю 664 тысяч сялянскіх двароў прыпадала 33,5 працэнта, прытым самай горшай зямлі, якая апрацоўвалася сахой і бараной.

Ратуючыся ад галечы, сяляне тысячамі ўходзілі са сваіх родных месц. За 50 дарэвалюцыйных год з Беларусі разышлося па ўсім свеце амаль паўтара мільёна чалавек, не лічачы дзяцей.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя дала магчымасць беларускай вёсцы пераадолець векавую адсталасць. Ужо к 1940 году на базе 800 тысяч дробных сялянскіх гаспадарак былі створаны буйныя калектыўныя гаспадаркі. У гэты час на палях працавала 9,7 тысячы трактараў, больш чым 10 тысяч культыватараў, паўтары з лішнім тысячы камбайнаў і многа іншых глебаапрацоўчых і ўборачных машын.

Вайна спыніла і адкінула назад развіццё беларускай вёскі. Гітлераўскія акупанты разграбілі маёмасць калгасаў, саўгасаў і машынна-трактарных станцый. Знішчылі і вывезлі ў Германію ўсе трактары, сельскагаспадарчыя машыны, каля 70 працэнтаў буйной рагатай жывёлы, мільён галоў свіней, авечак, коз і многа коней. Разбурылі і спалілі больш чым дзесяць тысяч сёл і вёсак. Цэлыя раёны былі ператвораны ў пустыню.

Пасля выгнання захопнікаў з нашай краіны працоўныя рэспублікі з дапамогай вялікага рускага народа ў кароткі тэрмін залячылі раны, нанесеныя вайной, і дабіліся значных поспехаў ва ўздыме сельскагаспадарчай вытворчасці. Калгасы і саўгасы былі аснашчаны новымі сучаснымі сельскагаспадарчымі машынамі. Цяпер на палях рэспублікі працуе амаль 70 тысяч трактараў у пераліку на 15-сільныя, 11 тысяч збожжавых камбайнаў, у тым ліку трактары, камбайны і аўтамабілі, пабудаваныя на беларускіх заводах, і многа іншай складанай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Цяпер у грамадскіх гаспадарках працуе звыш 13 тысяч аграномаў, заатэхнікаў, ветэрынарных урачоў, інжынераў і тэхнікаў-механікаў і рад іншых спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй.

У цяперашні час толькі для сельскай гаспадаркі рэспублікі рыхтуюць кадры з вышэйшай сельскагаспадарчай адукацыяй Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія і тры інстытуты і з сярэдняй—28 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія штогод выпускаюць больш чым 5 тысяч аграномаў, заатэхнікаў, інжынераў, эканамістаў і іншых спецыялістаў.

Рост механізацыі, павелічэнне пастаўкі сельскай гаспадарцы мінеральных угнаенняў дазволілі калгасам і саўгасам значна расшырыць пасяўную плошчу ўсіх сельскагаспадарчых культур. У 1963 годзе ў параўнанні з 1953 годам пасяўная плошча расшырана больш чым на 800 тысяч гектараў.

Значных поспехаў рэспубліка дасягнула ў развіцці жывёлагадоўлі. Валавая вытворчасць малака ў грамадскіх гаспадарках у 1962 годзе ў параўнанні з 1953 годам павялічана ў 4 з лішнім раза, сярэдні надой малака на адну карову—амаль на 60 працэнтаў, валавая вытворчасць мяса—больш чым на 40 працэнтаў. Калі ў перадваенным 1940 годзе ў рэспубліцы на душу насельніцтва было атрымана мяса 30 кілаграмаў, малака 221 кілаграм, яек 67 штук, то ўжо ў 1961 годзе мяса было атрымана 50 кілаграмаў, малака 431 кілаграм, яек 125 штук.

Буйная грамадская вытворчасць, калектыўная праца далі магчымасць працаўнікам сяла раскрыць усе свае здольнасці, сваё ўменне, свой творчы талент. У калгасах і саўгасах выраслі выдатныя майстры сельскагаспадарчай вытворчасці—ільнаводы, жывёлаводы, буракаводы, кукурузаводы і іншыя. Партыя і савецкі ўрад высока ацанілі іх працу. Больш чым 80 чалавекам прысвоена ганаровае званне Героя Сацыялістычнай Працы. Звыш дзевяці тысяч працаўнікоў сяла ўзнагароджана ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза.

Хто ж гэтыя людзі?

Ці мог у дарэвалюцыйны час хлопец з беднай сялянскай сям'і вёскі Мышкавічы Магілёўскай вобласці Кірыл Пракопавіч Арлоўскі марыць, што ён стане двойчы героем—Героем Савецкага Саюза і Героем Сацыялістычнай Працы, дэпутатам Вярхоўнага Савета Саюза ССР і старшынёй калгаса ў вёсцы, дзе ён нарадзіўся? Або ўзяць даярку калгаса імя Жданава Брэсцкай вобласці Лідзію Іванаўну Асіюк, якая праславіла сябе сваёй доблеснай працай. Радзіма прысвоіла ёй высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы, а аднавяскоўцы выбралі яе дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Дасягненні сельскай гаспадаркі грунтуюцца на яе механізацыі і хімізацыі. Да рэвалюцыі беларускі селянін практычна не ведаў прамысловых угнаенняў, мала іх было і перад вайной. За апошнія 10 год колькасць прамысловых угнаенняў павялічылася ў тры разы і складае ў разліку на гектар ворыўнай зямлі больш 50 кілаграмаў спажыўных рэчываў—азоту, фосфару і калію. У выніку ўкаранення высокапрадуктыўных культур і большага прымянення ўгнаенняў гектар беларускай зямлі зараз дае ў паўтара раза больш прадукцыі, чым у 1913 годзе.

Цяпер у краіне створаны ўсе неабходныя ўмовы для паскоранага развіцця хімічнай прамысловасці. Хуткімі тэмпамі будуюцца прадпрыемствы па выпрацоўцы азотных, калійных і фосфарных угнаенняў і іншыя хімічныя камбінаты. У Беларусі пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю Гродзенскі азотнатукавы і Салігорскія калійныя камбінаты, прадукцыя якіх пайшла ўжо на палі калгасаў і саўгасаў. У бліжэйшы час будзе пабудавана яшчэ рад камбінатаў па вырабу мінеральных угнаенняў.

Павелічэнне вытворчасці і ўнясенне ў глебу мінеральных угнаенняў ужо к 1970 году павысіць прадукцыйнасць беларускай зямлі ў тры-чатыры разы.

Беларуская неўрадлівая ў мінулым зямля, з якой некалі ўцякаў селянін за моры, стала карміліцай. І дары яе з кожным годам становяцца ўсё багацейшыя.

Прадукцыя Барысаўскага лесахімічнага

У розныя канцы Савецкага Саюза і за граніцу ідзе прадукцыя Барысаўскага лесахімічнага завода. Гэта прадпрыемства выпускае канфоль, шкіпінар, флотамасла, якія ідуць у папяровую, мылаварную, гуматэхнічную і іншыя вытворчасці.

У гэтым годзе намячаецца выпуск новага рэчыва—альфа-пінену для вытворчасці ядахімікатаў, неабходных у сельскай гаспадарцы для аховы раслін ад шкоднікаў.

Гвардзейцы працы

Гвардзейцам працы на Магілёўскім рамонтным заводзе называюць слесара Ул. Казанкова. Уладзімір Гаўрылавіч пастаянна займаецца пошукамі новага. Ад укаранення ў вытворчасць яго замкнёнай вадзяной сістэмы прадпрыемства сэканоміла амаль 1 300 рублёў.

Цяпер на заводзе кожны чацвёрты рабочы з'яўляецца рацыяналізатарам. Летась заводскія ўмельцы ўнеслі больш чым 60 прапаноў.

Фасфарыты руднага Алтая

Шматгадовыя пошукі геолагаў руднага Алтая ўвянчаліся поспехам. На горным хрыбце Чынгізтаў знойдзены пластавыя праяўленні фасфарытаў магутнасцю да чатырох метраў, якія працягнуліся амаль на сто кіламетраў.

АБ САВЕЦКАЙ НАФЦЕ

нафты выклікаў адлігу на сусветным рынку.

Якая ж будучыня савецкай нафты? У Савецкім Саюзе ўвесь замежны гандаль нафтай ажыццяўляе аб'яднанне «Саюзнафтаэкспарт», адзін з найбольш буйных і надзейных экспарцёраў нафты і нафтапрадуктаў у свеце. У сучасны момант яно падтрымлівае гандлёвыя адносіны з 50 краінамі, сярод якіх мы бачым Швецыю, Італію, Заходнюю Германію, Францыю, Японію, Індыю, Фінляндыю, Грэцыю, Цэйлон і іншыя краіны.

Многія з пакупнікоў рускай нафты—эканамічна слабаразвітыя краіны, якія адчуваюць востры недахват замежнай валюты, а таксама маладыя дзяржавы, якія з законнай падазронасцю адносяцца да тых пастаўшчыкоў нафты, якія маюць бруднае каланіяльнае мінулае. Але ёсць сярод іх і проста разважлівыя пакупнікі, такія, як Італія, Японія або скандынаўскія краіны.

Савецкі Саюз часта абвінавачваюць у тым, што ён зыходзіць з палітычных матываў. Аднак гэта абвінавачванне робіцца яўна не па адрасу. Няўжо замежныя кампаніі могуць сцвярджаць, што яны займаюцца толькі чыстай камерцыяй і чужыя палітыцы?

Савецкі Саюз ніколі не дабіваўся і не дабіваецца канцэсій. Ён проста пасылае сваіх спецыялістаў у розныя слабаразвітыя краіны, як, напрыклад, у Афганістан ці Пакістан, дзе яны шукаюць нафту, або Індыю і ААР для будаўніцтва нафтаачышчальных заводаў. Сам Савецкі Саюз не займаецца капіталаўкладаннямі з мэтай атрымання прыбыткаў, а прадастаўляе крэдыты на льготных умовах. Ясна, што такія адносіны служаць толькі ўмацаванню дружалюбных сувязей Савецкага Саюза і многіх дзяржаў Азіі і Афрыкі.

«КАБ ЗАБЫЦЬ ПРА ТЫЯ ЧАСЫ...»

Гэта было 35 год таму назад у часы панавання белапалякаў. У маі 1928 года ў пошуках работы разам з дзесяткамі такіх жа малазямельных маладых і дужых мужчын я завербаваўся і паехаў у «краіну серабра» — Аргенціну.

Тры месяцы непасільнай работы на рамонце чыгункі ў правінцыі Карантэс паказалі нам усю прыгажосць капіталістычнага «раю».

... Халадзільны цэх на мясакамбінаце ў Расарыо. Сюды накіроўвалі самых дужых. Але не кожны вытрымліваў цяжкія ўмовы працы. Здароўе маё пахіснулася.

За сваю працу я меў 15 пеза ў дзень. Вось і жыві, дапамагай сям'і, якая засталася ў Вілейскім павеце!

Многія гады прайшлі ўдалечыні ад Радзімы. І каб можна было выкрасліць іх, забыцца пра іх! Дзеля чаго працаваў там? Выходзіць, толькі для таго, каб назбіраць грошы на білет і з пустымі рукамі пераступіць парог дома сына, які вырас без бацькі.

Дзень 18 мая 1963 года быў самым радасным ў маім жыцці: я вярнуўся на сваю зямлю.

Краіна Саветаў сустрэла мяне, як добрая маці сустракае сваіх блудных сыноў. І я шчаслівы, што разам з усімі савецкімі людзьмі працую на сябе, на свой народ.

Баляслаў ГРЫБОВІЧ.
Мінская вобл.,
Вілейскі раён,
в. Куранец.

ПРАЗ 100 ГОД

У 1964 годзе спаўняецца сто год з дня адкрыцця першай школы ў Лагойску. Што яна ўяўляла з сябе ў той час, дагэтуль заставалася невядомым. Але вось у адным з жылых дамоў знойдзен архіў Лагойскай воласці за 1884 год. У ім быў акт праверкі школы інспектарам Чартковым, рахунак за рамонт будынка і спіс навучэнцаў. Гэтыя дакументы даюць магчымасць аднавіць сапраўднае становішча школы. Навучальная ўстанова знаходзілася ў цесным і старым памяшканні. Пры ім не было падсобных пабудоў, не хапала мэблі. Колькасць навучэнцаў складала 23 чалавекі.

У сваёй запісцы Чарткоў просіць школьны савет расшырыць класны пакой, зрабіць дадаткова некалькі вучнёўскіх сталоў, лавак і... дабавіць 50 рублёў платы настаўніку.

Але, мяркуючы па дакументах, гэты акт не разглядаўся. Больш таго, мінскі губернатар Пятроў пісаў валасным старшыням: «Мець строгае назіранне, каб у воласці не было адкрываема тайных школ для навучання пісьменнасці сялянскіх дзяцей... і ў выпадку, калі б аказаліся такія школы, неадкладна іх закрываць і даносіць пра гэта па прыналежнасці».

Як далёка адышоў у мінулае той час. Савецкая дзяржава нічога не шкадуе для выхавання маладога пакалення. Пяць год назад у Лагойску пабудавана выдатная трохпавярховая школа, на якую выдаткавана звыш ста тысяч рублёў. У ёй добра абсталяваныя класы, ёсць бібліятэка, пакой для пазакласнай работы, фізкультурная зала, майстэрні. Цяпер у Лагойку функцыяніруюць дзве сярэднія школы, у якіх навучаецца звыш 900 дзяцей. Працуюць 68 настаўнікаў, якія маюць у асноўным высшую педагагічную адукацыю. Школы выдатна абсталяваны. Акрамя гэтага, у гарадскім пасёлку працуе музычная школа, ёсць дзіцячы сад і яслі.

Б. САСНОЎСКІ.

У БАЦЬКОЎСКІМ ДОМЕ

СВЕТЛАГОРСК. Тут у лясах былога Кастрычніцкага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны дзейнічалі атрады народных мсціўцаў. Гарэла зямля пад нагамі акупантаў. У бяссільнай злосці фашысты палілі вёскі, забівалі мірных жыхароў.

Цяжкі лёс напаткаў і вёску Кавалі.

2 красавіка 1942 года фашысты поўнасцю знішчылі яе, а ўсіх жыхароў сабралі ў свіран і спалілі. Сярод іх была і сям'я дзяжурнага па станцыі Рабкор С. Данілевіча — маці, дзве дачкі. Ніхто не ведаў, што чатырохгадоваму сыну Анатолю ўдалося непрыкметна ўцячы, калі фашысты гналі жыхароў вёскі да месца расправы. Хлопчык знайшоў прытулак у другой вёсцы, а пасля вызвалення Беларусі апынуўся ў Баранавічах, у дзіцячым доме.

Увесь час Анатоль шукаў сваіх бацькоў. А нядаўна — праз 21 год — з радасцю пераступіў парог бацькоўскага дома на станцыі Рабкор.

ПРЫГОЖАЯ СЕЛЕТА ЗІМА Ў МІНСКУ!

Фотаэцюд К. Якубовіча.

У МУЗЕІ ДРУЖБЫ

Вёска Кругавец-Калініна Добрушскага раёна знаходзіцца на мяжы трох рэспублік — Беларускай ССР, Расійскай Федэрацыі і Украінскай ССР. У гонар 40-годдзя з дня ўтварэння Саюза ССР у Кругавец-Калінінскай васьмігадовай школе быў адкрыты музей ленінскай дружбы народаў.

Яшчэ не мінуў і год з дня адкрыцця музея, а ў ім ўжо многа экспанатаў. Тут ёсць твор Тараса Шаўчэнкі «Кабзар» з 89 аўтографамі украінскіх пісьменнікаў, «Новая зямля» Якуба Коласа з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў. У фондах музея захоўваюцца экспанаты з Літвы, Грузіі, Латвіі і іншых саюзных рэспублік

Нядаўна музей атрымаў канстытуцыю Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі. З Венгрыі даслалі фотаальбом, які адлюстроўвае вызваленне гэтай краіны савецкімі войскамі. З Румыніі паступіла газета «Новы вік» на ўкраінскай мове. Гомельскі абласны краязнаўчы музей даслаў партрэты герояў Вялікай Айчыннай вайны — ураджэнцаў трох сумежных абласцей — Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай.

Музей ленінскай дружбы народаў наведваюць не толькі калгаснікі мясцовай вёскі, але і суседзі з рускай вёскі Новыя Юркавічы і украінскай — Сяньковкі. Выканком Добрушскага райсавета дэпутатаў працоўных прыняў рашэнне пабудаваць спецыяльны будынак для музея.

А. КУРЛОВІЧ.

НОВЫ КЛУБ У КАЛГАСЕ

У цэнтры калгаса «Пераможац» стаіць прыгожы трохпавярховы будынак. Ён зусім нядаўна здадзены ў эксплуатацыю. Гэта новы калгасны клуб. Тут глядзельная зала на 200 месц, пакоі для заняткаў самадзейнасці, бібліятэка.

М. ДАНОВІЧ.

НЯСВІЖ— ГОРАД СТАРАЖЫТНЫ...

Ёсць у Беларусі гарады, дзе асабліва прыкметны кантрасты паміж старым і новым. Кідаюцца ў вочы гэтыя кантрасты і ў Нясвіжы, дзе многія будынкі—сама гісторыя. А гісторыя горада ўходзіць у далёкае мінулае...

Помнікаў старажытнасці ў Нясвіжы многа, выдатнасці на кожным кроку. Тут вучыўся паэт Кандратовіч-Сыракомля, а пазней і Якуб Колас. У адным з будынкаў калісьці друкаваў свае кнігі беларускі асветнік Сымон Будны...

Жыхары Нясвіжа любяць свой старажытны горад і ганарацца ўсім новым, што ў ім ствараецца. Не пазнаць цяпер горада. Колькі тут сучасных будынкаў! Не так даўно пабудаваны сапраўдны палац для дзетвары, цудоўная школа, дом культуры, клуб. Будуецца яшчэ адна школа на 1 000 месц. Бадай, раней і за паўвека не будавалася ў Нясвіжы столькі, колькі за апошнія тры гады.

У цэнтры горада—новая аўтобусная станцыя. Штодзённа дзесяткі маршрутных аўтобусаў праходзяць праз Нясвіж, які стаў важным вузлом транспартных зносін.

Разнастайнае культурнае жыццё горада. Старэйшы беларускі самадзейны кампазітар Касач піша музыку, кіруе харавым калектывам. Мастак Сеўрук малюе новыя віды горада.

Хутка будзе ў Нясвіжы свой краязнаўчы музей. Выхаванцы мясцовых школ, настаўнікі і многія гараджане даўно ўжо збіраюць для яго экспанаты.

Асабліва прыгожы Нясвіж летам, калі сюды з'язджаюцца сотні людзей, каб папраўціць сваё здароўе ў вядомым у Беларусі санаторыі.

Я. САДОЎСКІ.

Нашы вёскі і гарады

За грамадскія сродкі

У калгасе імя Жданава Жыткавіцкага раёна хутка расце машынна-трактарны парк. Толькі ў мінулым годзе арцель набыла тры трактары, збожжавы і сіласаўборачныя камбайны і рад іншых машын. Цяпер у арцелі 13 трактараў. Усё больш шырокі размах набывае і будаўніцтва. Больш чым дваццаць сем'яў хлебаробаў з дапамогай арцелі пабудавалі новыя дамы. Узведзена некалькі грамадскіх памяшканняў. У вёсцы Любавічы будуюцца дзве лазні і цагляны клуб.

За грамадскія сродкі трынаццаць калгаснікаў пабывалі ў санаторыях Крыма, Каўказа і Прыбалтыкі.

І. НОВІКАЎ.

НАМ УСЁ ПА ПЛЯЧЫ

Камянчане — мая радзіма. Тут я нарадзіўся, пражыў свае 50 год. На маіх вачах мянялася вёска, людзі, іх жыццё. Я яшчэ добра памятаю Камянчане ў той час, калі тут гаспадарылі паны. Сяляне валодалі мізэрнымі кавалачкамі зямлі. Жылі ў нястачы...

Пачатак вялікім пераменам у нашым жыцці паклала калектыўная праца. Аб'яднаўшыся ў агульную гаспадарку мы навучыліся вырошчваць багатыя ўраджаі, гадаваць статкі. У калгасе ўсе работы механізаваны. На месцы старых, пахілых гумнаў выраслі дабротныя гаспадарчыя пабудовы.

За сваю працу людзі атрымліваюць добрую плату. Кожны год у калгасную касу паступае больш чым 300 тысяч рублёў. На працадзень у гэтым годзе выплацілі больш як 2 рублі. Паляпшэнне дабрабыту калгаснікаў адчуваецца ва ўсім: і ў добрым адзенні людзей, і ў мэблі, якая стаіць у іх новых дамах, і ў пенсіях, што прызначаюцца састарэлым калгаснікам, і ў аплачваемых водпусках.

Часам бывае, глядзіш на нашы багацці, на шчаслівае жыццё і думаеш, адкуль усё гэта ўзялося? Дзе крыніца нашага багацця? Усе нашы даброты прынесла праца, плённая, творчая, калектыўная праца. Кожны з нас разумее, што ў адзіночку мы б нічога не дабіліся. Цяпер нам усё па плячы.

Таму такой пашанай карыстаюцца ў калгасе людзі працы.

Е. ГІРЧЫЦ,
калгаснік сельгасарцелі «Рассвет» Іўеўскага раёна.

ВЕЧНА ЖЫВЫ

(Пачатак на 1-й стар.)

Камуністычнай партыяй і савецкім народам у небывала кароткія гістарычныя тэрміны. Важнейшымі састаўнымі часткамі гэтага плана былі: індустрыялізацыя краіны, электрыфікацыя ўсёй народнай гаспадаркі, перавод невялікай раздробленай сялянскай гаспадаркі на шлях буйнога сацыялістычнага земляробства, ажыццяўленне культурнай рэвалюцыі. Цяпер Савецкі Саюз — магутная індустрыяльная і калгасная дзяржава з самай перадавой навукай, тэхнікай і культурай.

Ленін бязмежна любіў свой народ, і народ бязмежна любіў Леніна. Народ і Ленін — гэта адно цэлае. Ленін увасобіў у сабе самыя лепшыя рысы нашага народа. Ясны розум, жалезная стойкасць, свяшчэнная нянавісць да ворагаў, бязмежная любоў да Радзімы і народа, рэвалюцыйная палымянасць, кіпучая энергія ў працы і барацьбе — усё гэта знайшло сваё самае яркае ўвасабленне ў Леніне.

Уладзімір Ільіч не толькі вучыў народ, але і вучыўся ў народа, раячыся па ўсіх пытаннях з прадстаўнікамі шырокіх мас. Для Леніна аднолькава былі важны думкі як членаў Цэнтральнага Камітэта партыі і Савецкага ўрада, вучоных, так і думкі радавых рабочых, сялян, чырвонаармейцаў. У іх выказваннях Уладзімір Ільіч чуў голас народных мас, бачыў праяўленне іх надзей, спадзяванняў і імкненняў. Непарыўная сувязь з працоўнымі дазволіла Леніну ў цяжкіх гістарычных умовах весці народы Савецкай Расіі нікім яшчэ не зведанымі шляхамі барацьбы і будаўніцтва сацыялізма.

Выконваючы грандыёзную тэарэтычную і практычную работу па кіраўніцтву партыяй і маладой Савецкай рэспублікай у перыяд яе станаўлення ва ўмовах вайны, голаду і разрухі, Уладзімір Ільіч пастаянна знаходзіў час для сустрэч з рабочымі, сялянамі, інтэлігентамі. Яго простыя, палымяныя і пераканаўчыя прамовы слухалі працоўныя на заводскіх мітынгах, на з'ездах Саветаў, канферэнцыях, на сходах рабочых і сялян.

Стаўшы кіраўніком Савецкага ўрада, Уладзімір Ільіч не толькі не страціў свае сувязі з народам, а наадварот, незлічона памножыў і непахісна ўмацаваў іх. Як прапагандыста і агітатара яго пастаянна цягнула да мас. Толькі з 12 сакавіка 1918 года па 20 лістапада 1922 года (да хваробы) Уладзімір Ільіч выступаў у Маскве і ў Падмаскоўі, паводле няпоўных падлікаў, больш чым 200 разоў, не лічачы пастаянных выступленняў на розных пасяджэннях.

Ленін высока цаніў і такую сувязь з народам, як пісьмы рабочых і сялян у рэдакцыі газет.

— Гэта ж сапраўдныя чалавечыя дакументы! Гэтага ж я не пачую ні ў адным дакладзе!

Так гаварыў мне Уладзімір Ільіч, калі я як рэдактар «Беднаты» прыходзіў да яго з сялянскімі пісьмамі. Ён доўга, уважліва слухаў, чым жыве, чым займаецца вёска. Уладзімір Ільіч патрабаваў рэгулярных дакладаў «Беднаты» аб становішчы ў вёсцы з вытрымкамі з сялянскіх пісьмаў. Больш паўсотні такіх пісьмаў аб прадуктовым размеркаванні і аб цяжкім становішчы сялян было адабрана і ўвайшло ў мой даклад Леніну. І хутка мне прыйшлося пераканацца, што зводка сялянскіх пісьмаў не прапала дарэмна. Слухаючы даклад Леніна на X з'ездзе партыі аб замене прадуктовага размеркавання продпадаткам, я ў радзе месц адчуваў, што Уладзімір Ільіч карыстаўся сялянскімі пісьмамі як матэрыялам.

Камуністычная партыя, творча ўжываючы і развіваючы марксісцка-ленінскую тэорыю, пераадольваючы ўсё адсталае і аджыўшае, што перашкаджае паспяховаму руху савецкага грамадства да камунізма, заўсёды кіравалася і кіруецца ленінскімі ўказаннямі. Партыя смела, адкрыта асудзіла культ асобы Сталіна, пераадолела скажэнні і памылкі мінулага, настойліва праводзіць у жыццё меры, якія поўнасцю выключаюць магчымасць паўтарэння такіх памылак. Сярод гэтых мер асабліва важнае значэнне мае аднаўленне і далейшае развіццё ленінскіх норм партыйнага жыцця і прынцыпаў калектыўнага кіраўніцтва ва ўсіх звеннях партыі і дзяржавы.

Вынікі рознабаковай і нястомнай практычнай і тэарэтычнай дзейнасці партыі найбольш поўна паказаны ў Праграме КПСС, прынятай XXII з'ездам. Гэта новы раздзел у развіцці ленінізма. Гэта вялікая праграма пабудовы камуністычнага грамадства.

В. КАРПІНСКІ,
член КПСС з 1889 года,
Герой Сацыялістычнай Працы.

З жыцця землякоў за рубяжом

Гэтыя фатаграфіі прыслалі нам землякі з Клуба рускіх грамадзян у Сіднеі. Разам з савецкім народам яны адзначаюць усе яго святы, прыцягваючы да гэтага прагрэсіўныя аўстралійскія арганізацыі.

НА ЗДЫМКАХ: 1. Хор вучняў 1-га класа рускай мовы. Кіруе імі член клуба Лідзія Гардзееўна Сава. 2. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці выконваюць рускую пляску.

АД РЭДАКЦЫІ:
Выступленні гурткоў мастацкай самадзейнасці адбываюцца і ў іншых краінах, дзе жывуць нашы землякі. Часам вы збіраецеся на банкеты, маёўкі. Калі хто з вас робіць здымкі, прысылайце іх нам, як гэта зрабіў зямляк П. СУШЧЫЦ з Аўстраліі. Мы з задавальненнем змесцім іх у нашай газеце.

Жыву надзеяй на сустрэчу...

ГАЛАВАЧА УЛАДЗІМІРА АЛЯКСАНДРАВІЧА шукае маці **ГАЛАВАЧ ЛЮБОЎ ПАЎЛАЎНА**

Дарагі Валодзя!

З таго страшнага дня, як у наш дом уварваліся фашысты і схапілі цябе, прайшло многа год. Мяне не было ў той час дома, а калі вярнулася, суседзі сказалі, што пасадзілі цябе немцы ў машыну і павезлі за вёску Ленкаўшчыну расстрэльваць. Кінулася я ў лес, не адзін дзень шукала, бачыла трупы забітых, але цябе сярод іх не было. Знайшла толькі тваю фотакартачку. Яна ў мяне і цяпер як дарагая памяць.

Я часта чытаю ў газетах, што многія знаходзяць сваіх родных, а мне не шанцуе. Шукалі цябе добрыя людзі па ўсёй краіне, але дарэмна. З надзеяй пачуць штонебудзь аб табе ездзіла ў Польшчу да твайго роднага брата Мікалая. Ён трапіў туды ў час вайны, жыве цяпер у горадзе Жары Зялёнагрудскага ваяводства.

Калі ты жывы—адгукніся, сынок!

Я ўжо старая, мне 75 год. Жыву з дачкой, тваёй сястрой Соняй ў вёсцы Паляны. У мяне тры ўнучкі. Ірына працуе ў калгасе «Беларусь» учотчыцай, Марыя—у Маладзечна на мэблевай фабрыцы, Ала сёлета заканчвае 10-ы клас. Да вучобы дзяўчынка вельмі здатная. Жывём мы добра. Ёсць у нас усё неабходнае. Толькі вось гады мае бягуць, старэю. Няўжо так і не прыйдзецца цябе ўбачыць? Не веру гэтаму, усё жыву надзеяй на сустрэчу.

Твая маці **Любоў Паўлаўна ГАЛАВАЧ.**

НА

ПЁТР садзіцца ў крэсла. Тонкай ніткай уюцца ўспаміны, сплятаючыся ў тугі клубок, які ўвабраў у сябе так многа гора і зняваг і ў якім амаль зусім не засталося месца для радасці. Век бы не разблытваць гэты клубок, забыць усё. Але мінулае трывожна і настойліва напамінае аб сабе, і думкі ўжо ў каторы раз малююць яму адну карціну за другой.

Як недарэчна пачаўся май 1945 года. Яму б ужо даўно час быць у сваёй Чарамхоўцы, заросшай па самыя стрэхі хат духмяным бэзам, ахоўваемым строгімі, высокімі таполямі. Яму б слухаць на дзіва напеўную вясковую раніцу, дыхаць прыемным водарам траў, лугоў.

А замест гэтага ён апынуўся ў нейкім далёкім, незнаёмым канадскім горадзе. Чаму? Так, адразу і не растлумачыш. Нечага спалохаўся, некаму паверыў ды, прызнацца, да чорта стаміўся ад лагернага жыцця. І Мікалай адыграў тут немалую ролю. «Паедзем ды паедзем, паглядзім, як там, у Канадзе». Толькі потым ён даведаўся, што Мікалай гэта зусім не Мікалай, а клічуць яго Васілём. У час вайны яго судзілі за грабеж і адправілі ў штрафную роту. У першым жа баі Мікалай здаўся ў палон.

Прыехалі яны на ферму паблізу Атавы. Мікалай, спрытны, вёрткі хлопец, літаральна з першых мінут заваяваў сімпатыю гаспадара, плячыстага, пахмурнага чалавека ў насунутым на вочы капелюшы.

— Мой таварыш — інжынер, з сапраўдным дыпломам. Наогул, майстар на ўсе рукі,— ліслива ўсміхаўся гаспадару Мікалай.

Канадзец паглядзеў на Пятра цяжкім позіркам, памацаў яго пахілыя плечы і смачна плюнуў убок:

— Інжынер? Ну што ж, выдатна.

Ім давялося займацца ўсім: цягаць мяшкі, капаць зямлю, чысціць коней. Пётр так стамляўся, што к вечару ногі станавіліся ватнымі, і ён ледзь дабіраўся да пасцелі. Есці не хацелася. Ад празмернага напружання мучыла млоснасць. Засынаў ён хутка. А начамі яго праследаваў адзін і той жа кашмар: вялікі валасаты чалавек сціскае яго горла велізарнымі рукамі, спрабуючы задушыць...

Уставаў ён дашчэнту разбіты і вяла цягнуўся ў поле. Але рытм работы падхопліваў яго, і ён, нібы аўтамат, дацягваў да вечара.

Атрымаўшы першую зарплату, у ціхую ліпеньскую раніцу Пётр пайшоў у Атаву. Сонца яшчэ не ўставала, але было ўжо светла. Стаяла такая гулкая цішыня, што, здавалася, было чутна, як уздыхае, прачынаючыся, зямля. Пётр ішоў нешырокім прасёлкам. Прыемна халадзіла ногі буйная ранішняя раса.

Раптам за яго спіной пачуўся цяжкі конскі тупат. Пётр аглянуўся — гаспадар.

— Ты што ж, уцякаць? У мяне ўраджай гарыць, а ты...

— Вы прабачце, але ў мяне больш няма сіл. Паверце!

— Лжэш! Лёгкага жыцця захацеў у горадзе. Ну, ідзі-ідзі. Здохнеш з голаду!

Работы ён знайсці не мог. Інжынер? З яго проста смяяліся. Свае інжынеры працавалі бог ведае кім, а тут яшчэ эмігрант.

Усё ж Пётр знайшоў работу ў рачным порце, але непадоўга.

Цяпер у яго было многа вольнага часу. Бадай, занадта многа, нават для беспрацоўнага. Вечарамі ён гуляў па галоўнай вуліцы, падоўгу прастойваў перад шыкарнымі вітрынамі. Ён называў гэта «генеральнай праверкай» багацяў горада. Гэта, напэўна, здасца дзіўным, але ён любіў паветра начнога гіганта. Па ім можна было ўгадаць многае. Узяць хоць бы бензінавы пах, ён запаўняў усю праезную частку вуліцы.

На тратуары панавала парфумерыя. Гэта была вобласць мяккіх пахаў, пачынаючы ад французскіх «Кацi», гаспадынямі якіх былі лёгкія элегантныя істоты, захутаныя ў дарагое адзенне, і канчаючы рэзкім пахам мускуса ад размаляваных какатак. А як цудоўна пахне смажанай кавай! Смак яе Пётр ужо забыў даўно. Або, скажам, духмяны, салодкі пах кандытарскіх... Пётр так захапіўся сваімі думкамі, што не заўважыў, як спыніўся ля начной установы з яркай неонавай шыльдай: «Прыемная кампанія». З расчыненай фортачкі чуўся смех, музыка.

«А чаму б не паспытаць шчасця,— падумаў Пётр.— Чым чорт не жартуе». І ён упэўнена адчыніў дзверы. Гаспадара? Яго правялі на другі паверх у невялікі, добра абсталяваны пакой. За ломберным столікам сядзеў хударлявы нецвярозы чалавек і раскладваў пасьянс.

— Што? Работу? А ну, капялюш!

Суправаджаючы Пятра чалавек спрытна сцягнуў з яго капялюш.

— А-а... Бландзін. Бяру. Я люблю бландзінаў. Што? Інжынер? Ну, гэта ўжо мяне не цікавіць. А цяпер не перашкаджайце мне. — І ён зноў паглыбіўся ў пасьянс.

Так Пётр стаў швейцарам «Прыемнай кампаніі». Работа наогул была няцяжкая. Адчыняй і зачыняй дзверы, усміхайся. Асабліва ветлівы будзь з гаспадаром.

Упершыню Пётр убачыў паблізу клааку горада. Гадзінам к дзесяці, як правіла, прыходзілі сутэнёры. Маладыя напамаджаныя франты з буйнымі фальшывымі пярсцёнкамі на пальцах, яны паводзілі сябе так, нібы ў іх у кішэні мільён. Але Пётр ведаў, што часта пад асляпляльна белай манішкай не было нават ніжняй бялізны. Яны важна размаўлялі пра скачкі, нядбайна называючы імёны тузоў горада. А пад раніцу адбіралі выручку ў сваіх начных сяброўак і нярэдка білі іх за тое, што тыя спрабавалі схаваць пару долараў.

Часам ноччу сюды прыязджала Ілона.

Пётр пачаў бываць у яе. І неяк раптам заўважыў, што стаў да яе прывыкаць. Нават пачаў рэўнаваць. Але аднойчы яна ласкава загаварыла:

— Калі б ты ведаў, як мне надакучыла такое жыццё! Трэба прыдумаць нешта іншае. Ты мне павінен дапамагчы, Пётр.

— Ну што ж, калі ласка.

— Я хачу адкрыць невялікі бар. Але грошай яшчэ малавата. Ты... ведаеш жа, да гаспадара ходзіць многа багатых людзей... Закінь слоўца, што па пятніцах я прымаю ў сябе. Ты не думай, гэта не надоўга. Заробім, і самі станем гаспадарамі.

Рэпліка

Дачку замуж выдаюць...

«Не ў грошах шчасце...» Гэта старая жыцейская мудрасць у перакладзе мюнхенскага часопіса «Квік» абярнулася яркім трохрадковым загалоўкам «Грошы не адыгрываюць тут ніякай ролі». Няўжо штотыднёвік, які спявае салодкія гімны грашовым тузам, каралям і нават валетам, раптам перакаваўся і вырашыў выканаць гімн пачуццям? Зусім не. Проста «Квік» хацеў унесці заспакаенне ў розумы чытачоў: маўляў, будучы шлюбны альянс дачкі вядомага фінансіста Яльмара Шахта Канстанцыі і нашчадка старажытнага сіцылійскага рода дона Мішэля дзі Спадафора не ўнушае ніякіх апасенняў з пункту гледжання матэрыяльнага дабрабыту маладых.

Упамінаючы аб бацьку 22-гадовай нявесты (нацысцкім злачынцы Шахце), часопіс з жалем піша аб тым, што гэты «фінансавы чараўнік» цяпер не займаецца справамі. У пераліку яго «заслуг», што прыводзіцца штотыднёвікам, — і выратаванне Германіі ад інфляцыі ў 1923 годзе, і садзейнічанне Гітлеру ў мілітарызацыі краіны. На жаль, усё гэта цяпер «адышло ў нябыт», уздыхае «Квік».

Часопіс непакоіцца дарэмна. Дзейнасць гера Шахта не забыта. Яго прыслужніцтва фашызму — гэта кляймо, якое нічым не змыеш.

Б. П.

ДЗЕ ПРАЙШЛО ШЧАСЛІВАЕ ЮНАЦТВА...

Я ХАЧУ коратка расказаць пра сябе, пра сваю паездку на Радзіму ў кастрычніку мінулага года.

Я нарадзіўся ў 1927 годзе ў Мінску, вучыўся ў 31-й школе, любіў спорт, асабліва футбол. Як і ўсе мае аднагодкі будаваў планы на будучае, марыў. Але вайна пакалечыла мне жыццё. Маё першае знаёмства з вайной адбылося 24 чэрвеня 1941 года, калі на горад наляцелі фашысцкія бамбардзіроўшчыкі. Мінск стаў суцэльным пажарышчам. У Калодзішчах мы селі ў таварны састаў, але ў дарозе яго разбамбілі гітлераўцы. Было многа забітых і раненых. Пешшу дайшлі да Смілавіч, там заначавалі ў далёкіх сваякоў. Калі прачнуліся, у мястэчку ўжо былі фашысты. Прыйшлося вяртацца ў Мінск.

Нашай сям'і, як яўрэям, трэба было перасяліцца ў гета. У гета загінулі мае бацькі. У жніўні 1943 года мяне разам з іншымі маладымі хлопцамі адправілі ў Польшчу. Больш чым чацвёра сутак мы ехалі ў перапоўненых таварных вагонах без вады, без ежы. У Любліне ў нас адабралі ўсе рэчы. Мяне адправілі ў лагер Будзін. Там я працаваў на авіяцыйным заводзе. Голад, бруд, удары прыкладаў і бізуноў, пастаянны страх перад смерцю — вось якое было ў нас жыццё.

У Будзіне я прабыў да студзеня 1944 года. Потым быў перавезены ў лагер у Мелецы (Польшча). Там таксама працаваў на авіязаводзе. Умовы тыя ж самыя, з той толькі розніцай, што білі яшчэ больш. У гэтым лагеры ўсім зняволеным выпальвалі на правай руцэ кляймо.

Летам 1944 года ў сувязі з наступленнем савецкіх войск нас перавезлі ў Германію, у лагер Флёсенбург. Там я прабыў да красавіка 1945 года. Усіх забіць эсэсаўцы не паспелі, і таму нас пагрузілі ў таварныя вагоны, каб везці ўглыб Германіі. Ад'ехаўшы некалькі кіламетраў ад Флёсенбурга, мы трапілі пад бамбёжку. Далей ехаць было немагчыма. Пачаўся марш смерці. Тры дні і тры ночы мы ішлі без ежы. Час ад часу чуліся выстралы— расстрэльвалі тых, хто не мог ісці. Набліжаліся амерыканскія войскі. Эсэсаўская варта разбеглася. Цяжка было паверыць, што мы, нарэшце, свабодныя.

У Франкфурце-на-Майне, дзе я апынуўся, было многа савецкіх людзей, якіх гітлераўцы прывезлі сюды на работу. Але былі тут і такія, якія здрадзілі свайму народу і супрацоўнічалі з катамі. Такія людзі, безумоўна, баяліся вяртацца на Радзіму, бо ведалі, што за зробленыя злачынствы іх чакае справядлівы суд. Таму яны сеялі паклёпніцкія чуткі, быццам бы ўсіх, хто захоча вярнуцца дадому, адразу адвязуць ў канцлагеры ў Сібір. Магчыма, гэтыя чуткі на кагонебудзь і зрабілі ўплыў. але я ведаў, што гэта хлусня. Мяне спыніла іншае. Усе мае сваякі былі забіты. Адзіны брат, лётчык, загінуў на фронце. Сам я быў вельмі слабы пасля хваробы і не меў сіл вярнуцца туды, дзе страціў усіх блізкіх.

Ішлі гады. Я жаніўся, у мяне нарадзілася дачка. Але Радзіма цягнула мяне да сябе. І я вырашыў паехаць «у госці». ў родны Мінск. Мяне запалохвалі: не едзь, там цябе сашлюць у лагер, але я ні на што не звяртаў увагі. Нарэшце, атрымаў доўгачаканую візу.

С. Руткоўскі (справа) з сястрой і сябрамі ў Мінску.

З моманту атрымання дазволу да прыбыцця ў родны горад я не мог спаць ад хвалявання і шчасця. Здавалася, што поезд ідзе вельмі марудна. І вось праз 20 год я ступіў на святую зямлю майго горада. Сустракалі мяне два чалавекі: сяброўка дзяцінства і яе муж. Мы ўсе разам паехалі ў гасцініцу «Мінск», затым да іх на кватэру на Ленінскім праспекце. Потым ездзілі па горадзе. У мяне проста вочы разбягаліся. Едзем на маю вуліцу Карла Лібкнехта. Арыенціроўка — Дом урада і былы дзіцячы тэатр, усё астатняе змянілася да непазнавальнасці. Перасякаючы вуліцу Мясніова, не перастаю здзіўляцца— яна ў некалькі разоў стала шырэйшай. Выходзім на вуліцу, дзе прайшлі самыя шчаслівыя 14 гадоў майго жыцця. Стаю на тым месцы, дзе раней быў наш дом. Ох, як сціснулася маё сэрца!..

Вечарам у кватэры сяброў сабралася многа народу — былыя суседзі, знаёмыя. Многіх пазнаю, а мяне амаль ніхто. Дзіва што, я пакінуў Мінск хлопчыкам, а прыехаў лысым. Пачынаюцца пытанні, запрашэнні. На жаль, усе запрашэнні не магу прыняць. На трэці дзень знайшоў сваю стрыечную сястру Любу. Чаша майго шчасця была перапоўнена. А як мяне прымалі! Сталы ламаліся ад ежы і пітва. Я быў вельмі здзіўлены. Газеты ў ФРГ пісалі, што ў СССР не хапае прадуктаў. У Мінску магазіны поўныя тавараў і якіх тавараў! Грошы ў савецкіх людзей таксама ёсць, я бачыў, як яны куплялі многа дарагіх рэчаў. І ніякіх чэрг я не бачыў.

Цяпер пра горад. Што было прыгожага ў Мінску перад вайной? Дом урада, Палац піянераў, вуліца Карла Маркса, стадыён «Дынама», два кінатэатры. Вуліцы былі вузкія. А цяпер Мінск стаў прыгажуном. Шырокія вуліцы, светлыя дамы, больш чым 20 кінатэатраў, яшчэ больш прыгажэйшым стаў стадыён «Дынама». У парку імя Чалюскінцаў пабудавана дзіцячая чыгунка. У горадзе многа магазінаў, інстытуты, школы. Працоўныя жывуць у прасторных кватэрах з ваннамі, цэнтральным ацяпленнем і тэлефонам, маюць радыёпрыёмнікі, тэлевізары, магнітафоны. Кватэрная плата такая мінімальная, што параўноўваць з платай за жыллё ў ФРГ проста немагчыма. Кожны вечар для мяне наладжвалі вечарынкі, у гасцініцу прыходзіў позна ноччу. І па горадзе я многа хадзіў. Ніхто за мной не сачыў, ніхто не пытаў, дзе я бываю. Адным словам, я адчуваў сябе вольнай птушкай.

С. РУТКОЎСКІ.

ФРГ.

РАЗДАРОЖЖЫ

Расказ «перамешчанай асобы»

Пётр пахаладзеў. Ён не верыў сваім вушам.

— Не, не! — закрычаў ён так, нібы паміж імі была рака. — Толькі не гэта. Я ж чалавек... Навошта ж так?..

— Ну, глядзі, табе відней,— сказала яна холадна і адхінулася ад яго.

А праз некалькі дзён Ілона прыехала ў «Прыемную кампанію» з паклоннікамі. Двое з іх завязалі з Пятром бойку, разбілі шкло ў дзвярах. Яны аказаліся сынкамі буйных дзялкоў, былі пастаяннымі наведвальнікамі, і... Пятра звольнілі.

З таго часу Пётр больш не бываў на цэнтральнай вуліцы. Ён пасяліўся на ўскраіне горада ў маленькім старым доміку.

Работы, як заўсёды, не было. Набегаўшыся па горадзе, Пётр прыходзіў адпачыць у парк. Тут ціха, утульна, пахла пажоўклай травой і яшчэ нечым такім асеннім, ад чаго на душы рабілася крыху сумна. Пётр заўважыў, што ў гэтыя ж гадзіны на суседняй лаўцы заўсёды сядзела дзяўчына. Звычайна яна чытала кніжку

З ім пачалося нешта дзіўнае. Раней у парку ён заўсёды адпачываў душой, на яго находзіла нейкае бяздумнае, добрае заспакаенне. А цяпер? Цяпер, калі дзяўчына на суседняй лаўцы не было, ён пачынаў нерваваца.

Здаецца, гэта было ў сераду. Калі Пётр прыйшоў у парк, дзяўчына ўжо сядзела на «сваёй» лаўцы.

Пётр хацеў пайсці далей, але замест гэтага нечакана апусціўся на лаўку.

— Вы заўсёды тут адна. Калі, вядома, не лічыць кнігу.

— Ваша кампанія таксама немнагалюдная.

Яны разгаварыліся. Пётр прадставіўся:

— Інжынер Нікіфараў.

— О, вы інжынер! — з захапленнем усклікнула яна.

Яму хацелася сказаць, што ён, уласна, былы інжынер, а цяпер проста беспрацоўны. Але ў яго не хапіла мужнасці сказаць праўду.

— А я проста прадаю кветкі. Працую тут побач, у магазіне на Воткінстрыт.

Яна расказала, што яе бацька — дробны служачы муніцыпалітэта. Сям'я — шэсць чалавек. Але ім пашанцавала, яна ўладкавалася на работу. Заработак не вельмі вялікі, але ўсё ж...

Яны пачалі сустракацца. Ліля аказалася прыемнай субяседніцай.

Яны ўжо ўсё расказалі адзін аднаму пра родных, блізкіх, знаёмых. І неяк самі сабой узніклі размовы пра будучыню:

— Вы што-небудзь адкладваеце? — неяк спытала яна. — У мяне ўжо ёсць невялікія зберажэнні.

Што ёй адказаць? Сказаць праўду? Не, толькі не гэта. Страціць яе і зноў застацца аднаму — немагчыма.

— Ведаеце, я неяк пра гэта і не думаў. Прывык да халасцяцкага жыцця. Я ж звычайна абедаю ў «Асторы», потым сёе-тое высылаю сястры, брату...

Пётр сам здзіўляўся, як складна ён ілжэ.

— О, вы не павінны так кідацца грашыма. Трэба ж думаць і пра будучыню.

— Так, бадай, час брацца за розум. Вось калі б не вы, то...

— Вы абяцаеце быць скромным?

— Ну, вядома. Для вас я гатоў пайсці на што хочаце.

Неяк так здарылася, што пра домік за горадам яны цяпер пачалі марыць разам.

...У Пятра канчаліся грошы. Ён ніяк не мог знайсці работу, нават часовую. Пётр баяўся, што Ліля, нарэшце, дазнаецца праўду. Таму, ідучы на спатканне, ён апранаўся асабліва старанна.

Развіталіся яны заўсёды ля гранітных варот. Сёння Ліля больш звычайнага затрымала сваю руку ў яго руцэ.

— Ты ведаеш... Я вырашыла цябе пазнаёміць са сваімі. Праз два тыдні ў мяне дзень нараджэння. Гэта добрая прычына... Згодзен?

— Ну, вядома, я прыду.

Дадому ён ішоў, поўны светлых надзей. Але раптам яго радасць нібы хваляй змыла. Ён жа інжынер, чалавек, які зарабляе кучу грошай. Значыць, ён павінен прынесці дарагі падарунак. А ў яго ў кішэні адзін долар 20 цэнтаў. О, чорт вазьмі! Дзе ж узяць грошай?

Усе дні, што засталіся да дня нараджэння Лілі, Пётр ліхаманкава шукаў работу. Але, як назло, усюды адказ. Заставаліся тры дні. Ён зусім было ўпаў у роспач. І вось, нарэшце, аб'ява: адна фірма запрашае на сезонную работу, збіраць дажджавых чарвякоў. Плата — чатыры долары за тысячу штук. Э, чорт з імі, куды ні ішло. Чарвякі дык чарвякі. І Пётр заключыў дагавор.

У першы ж дажджлівы дзень Пётр выйшаў збіраць чарвякоў. Неба хмурылася з раніцы. Рэзкі, парывісты вецер гнаў аднекуль з-за горада велізарную, з лілаватымі адценнямі хмару, якая хутка закрыла да краёў неба. Стала цёмна. Далёка ля гарызонта грымнула, і, нібы спяшаючыся дагнаць раскаты грому, паліў дождж. Пётр хутка даехаў да апошняга прыпынку трамвая і выбег на пустэчу. Якая радасць: ля першых жа лужын пачалі з'яўляцца ружаватыя чарвякі.

Было холадна. Захоплены работай, ён некалькі разоў падаў. Увесь вымазаны гразю, ён збоку выглядаў даволі-такі дзіўнай істотай.

Хутка ён стаміўся. А ў вядры было не больш чым дзвесце чарвякоў. Але Пётр спяшаўся. Дождж перастаў. Тады ён пачаў разграбаць лужыны, спадзеючыся знайсці там больш чарвякоў. Ныла паясніца. Ён устаў, з цяжкасцю разагнуўся і... абамлеў. Перад ім стаяла Ліля. Яна здзіўлена глядзела на Пятра, твар яе крывіла ўсмешка.

— Што з табой, Пётр?

Ліхаманкава працавала думка. «Гэта я для рыбалкі. Вядома, для рыбалкі». Але раптам у ім штосьці абарвалася, і ён, злосна захлёбваючыся, пачаў выкрыкваць:

— А гэта значыць тое, што я ўжо шэсць месяцаў без работы. Разумееш ты гэта ці не? Не, табе не зразумець, што значыць для інжынера збіраць чарвякоў. Вось у гэту гразь затаптана мая чалавечая годнасць, мае веды, мае...

Яна спалохана глядзела на яго шырока раскрытымі ад здзіўлення вачыма. Потым рэзка павярнулася і кінулася бегчы.

— Ліля, пастой, я табе зараз усё растлумачу,— няўпэўнена крыкнуў ён ёй наўздагон.

Але яна бегла ўсё хутчэй і хутчэй...

Цяжка, не, немагчыма забыць усё гэта. Хоць і дрэннае, але ёсць мінулае. А будучыня? Што чакае яго? Адзінота, нястача. Што рабіць, што рабіць? Падкажыце, людзі!

В. ГАЙЛЕ.
(«Русский голос». ЗША).

Глішуць землякі

«Схіляюся перад мужнасцю!»

Чытаючы кнігі, прысланыя вамі, я думаў: якіх велізарных ахвяр каштавала савецкім людзям гітлераўскае нашэсце! Мора людскога гора, рэкі крыві праліты на вытаптанай і выпаленай беларускай зямлі варварскай вайной.

Хіба можна без хвалявання чытаць кнігу «Гавораць загінуўшыя героі», дзе змешчаны запіскі, пісьмы і запісы на сценах турмаў і засценкаў, пакінутыя смяротнікамі? Ніякія катаванні, зверствы і пагрозы не маглі зламаць патрыётаў і прымусіць выкрыць таварышаў, указаць лагеры партызан.

Няма ў свеце такога народа, які б вынес адну дзесятую таго, што вынес савецкі народ, і не схіліўся перад захопнікамі. Колькі зверства і лютасці было ў фашыстаў! Нікога ж не шкадавалі: ні дзяцей, ні жанчын, ні старых, не кажучы пра салдат і партызан.

З вялікім задавальненнем і гордасцю чытаў я і кнігу «Салдацкая слава». Схіляю галаву перад мужнасцю, адвагай і ахвярнасцю разведчыкаў і сапёраў.

Будзе карысна, калі гэтыя кнігі прачытаюць многія нашы суайчыннікі за мяжой.

І. Ф.

Францыя.

КУЛЬТУРА і МАСТАЦТВА

Выступленне аб'яднанага хору калгасаў «Зара» і «Ленінскі шлях». Кіруе ім дырэктар Цырынскага сельскага дома культуры. Калектыў мастацкай самадзейнасці, створаны нямногім больш года назад, ужо заваяваў на Навагрудчыне папулярнасць.

Фота А. Перахода.

ДАСЛЕДАВАННІ БЕЛАРУСКІХ СЛАВІСТАЎ

У Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук БССР вядзецца вялікая даследчая работа ў галіне славістыкі. Гэтай праблематыкай займаюцца навуковыя супрацоўнікі створанага ў 1962 годзе ў саставе інстытута сектара агульнага і славянскага мовазнаўства.

У 1963 годзе выйшла ў свет манаграфія В. Мартынава «Славяна-германскае лексічнае ўзаемадзеянне старажытнейшага часу». Навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства АН БССР В. Вярэніч працуе над пытаннямі характару ўзаемадзеяння польскага дыялекта з беларускім у беларускім моўным акружэнні.

У верасні 1963 года В. Вярэніч камандзіраван па лініі ЮНЕСКО ў Варшаўскі універсітэт, дзе пад кіраўніцтвам вядомага польскага вучонага В. Дарашэўскага працягвае пачатыя даследаванні. Тройчы ён дакладваў аб некаторых выніках сваёй работы на пасяджэнні кафедры беларускай мовы Варшаўскага універсітэта. У саставе групы польскіх вучоных-мовазнаўцаў, сярод якіх былі прафесар В. Дарашэўскі і маскоўскі прафесар В. Арлова, В. Вярэніч прыняў удзел у дыялекталагічнай экспедыцыі ў Гарвалінскае (ПНР) па збору матэрыялаў для «агульнаславянскага лінгвістычнага атласа».

У Музеі гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці ў адной з залаў рыхтуюць экспазіцыю — «Бой ля Тэраспальскіх варот». Над новай дыярамай працуюць брэсцкія скульптар Леанід Шмакаў і мастак Уладзімір Старчакоў. НА ЗДЫМКУ: Л. Шмакаў (справа) і В. Старчакоў.

Шыта белымі ніткамі

8 студзеня пад купалам Капітолія з трыбуны новай сесіі кангрэсу было сказана нямала прамоў аб жаданні ЗША «стварыць свет, свабодны ад нянавісці, свет у якім панавалі б мір і справядлівасць». У дачыненні да Лацінскай Амерыкі гэта абяцанне прагучала так: ЗША «павінны стаць лепшымі суседзямі» лацінаамерыканскіх краін і супрацоўнічаць «з усімі мужчынамі і жанчынамі гэтага паўшар'я, якія вераць у свабоду і справядлівасць для ўсіх».

А роўна праз суткі, як гэта вядома ўсяму свету, «добры сусед» толькі за спробу панамцаў вывесіць у зоне канала свой нацыянальны флаг учыніў расправу над мірным насельніцтвам. У выніку—дзесяткі забітых і сотні параненых.

Выбух у Панаме, натуральна, выклікаў гучны рэзананс ва ўсім свеце. Усе людзі добрай волі поўны гневу і абурэння. Асабліва бурліць Лацінская Амерыка. Усюды праходзяць мітынгі і дэманстрацыі пад лозунгамі: «Рукі прэч ад Панамы», «Панама—панамцам!». Характэрна, што нават амерыканскі друк назваў падзею ў зоне Панамскага канала словам «мэсекр», што значыць крывавая разня. Словам, віноўнасць імперыялізму відавочная.

Але як часта бывае на Захадзе, любое імкненне народаў да незалежнасці тут жа скажаецца. На яго, як правіла, без усякіх на гэта падстаў навешваецца ярлык «камуністычных падкопаў». Не мінуў выкарыстаць гэты ярлык імперыялізм і зараз. У ход адразу ж была пушчана чутка, нібы хваляванне ў Панаме — «справа рук Фідэля і Масквы». А каб надаць гэтай хлусні бачнасць факта, ваенныя караблі ЗША пачалі абшукваць усе панамскія гандлёвыя судны, «правяраючы, ці няма на іх зброі».

Але хлусня заўсёды застаецца хлуснёй, у якое б адзенне яе ні прыбралі. Факты сведчаць, што прычыны масавых хваляванняў у Панаме—адкрытая акупацыя часткі тэрыторыі гэтай маленькай краіны і кабальныя ўмовы дагавору аб эксплуатацыі канала. Як вядома, панамскі народ вось ужо больш чым 60 год змагаецца за перагляд умоў гэтага дагавору. Буйныя дэманстрацыі пратэсту адбыліся ў Панаме ў лістападзе 1959 года, а затым летам мінулага года.

Як паказваюць апошнія падзеі, народ Панамы поўны рашучасці дабіцца справядлівасці. Яго патрабаванні падтрымлівае і савецкі народ. Пры разборы скаргі Панамы на пасяджэнні Савета Бяспекі прадстаўнік СССР падкрэсліў, што Савецкі Саюз рашуча выступае супраць ужывання сілы ў адносінах паміж дзяржавамі. Савецкі ўрад заклікае да ліквідацыі замежных баз на чужых тэрыторыях. Падзеі ў Панаме пераканаўча сведчаць аб неабходнасці такога кроку.

Сусветная грамадскасць і друк працягваюць абмяркоўваць новыя прапановы Старшыні Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчова, выкладзеныя ў Пасланні кіраўнікам дзяржаў (урадаў) краін свету. Чалавецтва горача вітае міралюбівую ініцыятыву СССР, накіраваную на збаўленне людзей ад цяжару гонкі ўзбраенняў і пагрозы войн.

«Нойес Дойчланд», Берлін.

НАШ календар

Друг і настаўнік моладзі

Хто з нас у пару маленства не захапляўся цудоўным светам легенд і казак. Ужо тады мы знаходзілі ў любімых кнігах добрых сяброў. Сярод іх быў у мяне Алёша Шабуневіч з аповесці Алеся Якімовіча «Незвычайны мядзведзь».

З таго часу пачалася ў мяне сталая дружба з кніжкамі Алеся Якімовіча, пісьменніка з нашай Уздзеншчыны — з вёскі Чурылава.

У нястачы і беднасці жыў будучы пісьменнік, быў пастушком, разам з бацькам ганяў па Уздзянцы плыты аж да самага Нёмана...

Сорак год прайшло, як Алесь Якімовіч надрукаваў свой першы твор. З таго часу пісьменнік радуе нас усё новымі і новымі творамі. Гэта вершы, казкі, загадкі, апавяданні, аповесці, нарысы, крытычныя артыкулы, кінасцэнарыі, п'есы для самадзейнага тэатра, пераклады на беларускую мову казак Пушкіна, баек Крылова, паэмы Някрасава «Каму жыць на Русі добра», апавяданняў Горкага, Гайдара, вершаў Маякоўскага... Толькі за пасляваенныя гады Алесь Якімовіч выдаў больш дваццаці кніжак. Мужнасці і гераізму, справядлівасці і сяброўству, стараннасці і працавітасці вучыць пісьменнік сваіх юных чытачоў.

Пісьменнік доўгі час працаваў у дзіцячых часопісах «Беларускі піянер» і «Іскры Ільіча», выдаў падручнік «Роднае слова», выкладаў беларускую мову і літаратуру ў тэхнікуме, настаўнічаў у школе. У час Вялікай Айчыннай вайны пісьменнік-камуніст ідзе на фронт, камандуе стралковым узводам. У 1943 годзе ў баях пад Харкавам Алесь Якімовіч атрымлівае цяжкія раненні. Доўгі час лечыцца ў шпіталях. Затым працуе рэдактарам часопіса «Бярозка», старшым рэдактарам дзіцячай літаратуры Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, літаратурным кансультантам Саюза пісьменнікаў.

Цяпер Алесь Якімовіч працягвае працу па зборы і апрацоўцы беларускіх народных легенд і казак, нядаўна закончыў аповесць «Адкуль ліха на свеце», якая расказвае аб цяжкай долі хлопчыка ў часы прыгоннага права.

Сёння кнігі Алеся Якімовіча чытаюць ужо нашы дзеці і ўнукі. Але яго героі, працавітыя і дапытлівыя, не перастаюць цікавіць і нас, чытачоў яго першых твораў...

60 год даўняму сябру юных чытачоў. Шмат пройдзена, шмат зроблена. Выраслі ўжо і пасівелі тыя, што чыталі першыя апавяданні і казкі Алеся Якімовіча. А творы яго ўсё вядуць за сабой юнага чытача ў цудоўны свет праўды, раскрываюць перад ім хараство жыцця і рамантыкі.

Алесь МАХНАЧ.

Пауль ТРУНК

ПЕРАД СУДОМ— ЗАБОЙЦЫ

У ЗАХОДНЯЙ ГЕРМАНІІ, У ФРАНКФУРЦЕ-НА-МАЙНЕ, ПАЧАЎСЯ ПРАЦЭС НАД НАЦЫСЦКІМІ ЗЛАЧЫНЦАМІ. СУДЗЯЦЬ ВЫЛЮДКАЎ АСВЕНЦІМА. МНОГАЕ З ПАВЕДАМЛЕННЯЎ, ЯКІЯ ПАЯЎЛЯЮЦЦА Ў ЗАХОДНЕГЕРМАНСКІМ ДРУКУ, НАСЦЯРОЖВАЕ. АБВІНАВАЧВАЮЦЦА ТОЛЬКІ 22 ЧАЛАВЕКІ, ПРЫЧЫМ ТОЛЬКІ 9 З ІХ УЗЯТЫ ПАД ВАРТУ. А У АСВЕНЦІМЕ Ж БЫЛО КАЛЯ 6 ТЫСЯЧ КАТАЎ-ЭСЭСАЎЦАЎ. ПАСЛЯ ЗАКАНЧЭННЯ ВАЙНЫ МНОГІЯ З ІХ ВЯЛІ БЯЗБЕДНАЕ ЖЫЦЦЁ. ПРЫНЯТЫ МЕРЫ ДА ТАГО, КАБ ПАЗБЕГНУЦЬ ШЫРОКАГА АПАВЯШЧЭННЯ ХОДУ ПРАЦЭСУ: У ЗАЛЕ МОГУЦЬ ПРЫСУТНІЧАЦЬ УСЯГО 60 ЧАЛАВЕК.

У Франкфурце-на-Майне ідзе адзін з самых значных пасляваенных працэсаў у Заходняй Германіі, на якім разбіраюцца справы 21 эсэсаўца і аднаго «лагер-капо» з Асвенціма. Яны абвінавачваюцца ў «забойстве або дапамозе забойству пры вялікай колькасці злачынстваў, зробленых за перыяд з 1940 да ліквідацыі лагера ў студзені 1945 года». Сярод абвінавачваемых — ад'ютанты абодвух лагерных камендантаў — Геса і Бэра, гестапаўцы, урачы, лагер-, рапарт- і блокфюрэры. Паводле папярэдніх даных, працэс будзе працягвацца шэсць — восем месяцаў.

Канцэнтрацыйны лагер Асвенцім, пабудаваны пасля захопу Польшчы немцамі ў красавіку 1940 года на тэрыторыі былой аўстрыйскай казармы ў 70 кіламетрах ад Кракава, быў самым вялікім лагерам смерці ў «трэцім райху». Колькасць знішчаных там людзей не паддаецца дакладнаму падліку. Эсэсаўцы, што паўсталі перад франкфурцкім судом, ажыццяўлялі тое, што Гітлер і Эйхман задумалі за пісьмовым сталом як аўтаматызаванае забойства мільёнаў людзей.

У групе абвінавачваемых ёсць лагерныя гестапаўцы. У іх ліку пяцідзесяцішасцігадовы камерцыйны служачы, обершарфюрэр Вільгельм Богер з Штутгарта. Ён прымаў удзел у масавых расстрэлах вязняў лагера ля «чорнай сцяны». На допытах Богер збіваў вязняў да смерці. Так, напрыклад, ён двума выстрамі з пісталета забіў вязніцу лагера па прозвішчу Тофлер; ён трымаў галаву шасцідзесяцігадовага польскага свяшчэнніка пад струменем вады да таго часу, пакуль той не захлынуўся, а польскага генерала Длугішэўскага, які неймаверна схуднеў ад голаду, насмерць затаптаў нагамі.

Саракасямігадовы інжынер, обершарфюрэр СС Клаус Дылеўскі, які працаваў да апошняга часу экспертам па тэхнічнаму нагляду ў адной з устаноў Дзюсельдорфа, з'явіўся ў Асвенціме ў 1940 годзе, дзе ён спачатку служыў у ахове, а затым у гестапа. Ён асабліва вызначыўся ў 1941—1942 гадах, калі прымаў удзел у расстрэлах савецкіх камісараў.

Апальшчык Франц Гофман, гаўптштурмбанфюрэр, пяцідзесяці сямі год. Гофман абвінавачваецца ў тым, што ў дзіцячым лагеры Асвенціма ён адбіраў для газавых камер дзяцей ва ўзросце ад шасці да дванаццаці год. Зімой 1942/43 года ён выгнаў дзесяць — дванаццаць савецкіх ваеннапалонных голымі на мароз і прымусіў іх стаяць там да таго часу, пакуль яны не замерзлі.

Бухгалтар Артур Брэйтвейзер, ротэнфюрэр, пяцідзесяці трох год, які прыбыў у Асвенцім у 1941 годзе, удзельнічаў у першым выпрабаванні «цыклона Б» для знішчэння людзей.

Асобае месца сярод абвінавачваемых займае Эміль Бедэнарык. З кастрычніка 1940 года ён быў старастам блока і час ад часу ўзначальваў таксама штрафную роту лагера. Паводле слоў сведак, ён так жорстка здзекаваўся з вязняў, што многія з іх паміралі. Вядома многа выпадкаў, калі ён прымушаў людзей зімой станавіцца пад ледзяны душ, пакуль тыя не застывалі і не падалі.

«ЗЮДДОЙЧЭ ЦАЙТУНГ».

ПЛАН „ОСТ" І БЕЛАРУСКІЯ НАЦЫЯНАЛІСТЫ

КОЖНУЮ раніцу нашы газеты і радыё прыносяць новыя і новыя весткі аб пуску прадпрыемстваў, аб поспехах беларускай прадукцыі на міжнародных кірмашах, аб наваселлях, добрых кнігах, цікавых спектаклях. Спакойна жывуць і працуюць людзі: вырошчваюць хлеб, ходзяць у тэатры, пішуць музыку, гадуюць дзяцей. Дабрабыт, мір, шчасце дала нашаму народу Савецкая ўлада, нягледзячы на ўсе спробы капіталістычнага свету перашкодзіць нам будаваць новае жыццё, нягледзячы на жудасныя разбурэнні ў перыяд гітлераўскай акупацыі...

60-я гады... Іменна гэты час гітлераўцы меркавалі зрабіць апошнім этапам ператварэння ў жыццё плана «Ост», самага пачварнага, самага ганебнага плана ў гісторыі чалавецтва. Па гэтаму плану беларуская зямля, угноеная попелам крэматорыяў, павінна была стаць поўнай уласнасцю нацысцкіх каланістаў.

План «Ост» быў распрацаван галоўным упраўленнем імперскай бяспекі на чале з Гімлерам і адобраны Гітлерам. Ён прадугледжваў масавае знішчэнне славян і асабліва савецкага народа, у якім нямецкія фашысты бачылі асноўную перашкоду на шляху да сусветнага панавання; высяленне і раз'яднанне славянскіх народаў, знішчэнне іх дзяржаўнасці і культуры; ператварэнне нямногіх застаўшыхся ў жывых у сапраўдных рабоў.

Жудасна робіцца, калі ўявіш сабе, як два дзесяцігоддзі назад варвары ў чорных эсэсаўскіх мундзірах, схіліўшыся над картай свету, халаднакроўна планавалі забойствы мільёнаў, рыхтавалі страшны лёс нам і нашым дзецям. Цяжка паверыць, што рукой чалавека былі напісаны гэтыя радкі:

«Ёсць толькі наступныя магчымасці вырашэння праблемы: або поўнае знішчэнне рускага народа, або анямечанне той яго часткі, якая мае яўныя прыкметы нардычнай расы»... «Я спадзяюся, што нам удасца поўнасцю знішчыць паняцце «яўрэй»... Крыху часу спатрэбіцца для таго, каб на нашай тэрыторыі зніклі такія народнасці, як украінцы... Усё, што было сказана аб гэтых народнасцях, у яшчэ большай ступені адносіцца да палякаў».

Масавае знішчэнне савецкіх грамадзян гітлераўцы тлумачылі тым, што ад іх гэтага вымагаў разгорнуты партызанскі рух. Аднак вядома, што яшчэ 16 ліпеня 1941 года Гітлер заявіў: «Партызанская вайна мае і свае перавагі для нас, яна дае нам магчымасць знішчаць усё, што паўстае супраць нас». І тут жа аддаў загад расстрэльваць у Расіі «кожнага, хто коса паглядзіць на немца».

Чэрвень 1941 года... У першыя ж дні вайны гарэлі мірныя гарады і вёскі, самалёты-знішчальнікі касілі натоўпы бежанцаў. «На досвітку мы праехалі Баранавічы, — адзначыў у сваім дзённіку 28 чэрвеня нацыст Эміль Гольц. — Горад зруйнаваны... Па дарозе ад Міра да Стаўбцоў мы размаўлялі з насельніцтвам мовай кулямётаў. Крыкі, стогны, кроў, слёзы і шмат трупаў. Ніякага спачування мы не адчувалі».

А вось як занатоўвае свае «ўражанні» обер-ефрэйтар Іаганес Гердэр:

«Мы кідаем ручныя гранаты ў жылыя дамы. Дамы вельмі хутка гараць. Агонь перакідваецца на іншыя хаты. Прыгожае відовішча! Людзі плачуць, а мы смяемся над слязамі. Мы спалілі такім чынам вёсак дзесяць. У адной вёсцы мы схапілі першых трапіўшых пад рукі 12 жыхароў і адвялі на могілкі. Прымусілі іх капаць сабе прасторную і глыбокую магілу. Славянам няма і не можа быць ніякай літасці».

«Смерть славянам!» — з такім лозунгам уступіла гітлераўская зграя на беларускую зямлю. Увесь народ падняўся на свяшчэнную вайну з фашызмам. І толькі невялічкая група здраднікаў з душамі пад колер эсэсаўскіх мундзіраў прадалася ворагу, атрымліваючы ва ўзнагароду за здраду нямецкія кансервы і шнапс, маёмасць арыштаваных па іх даносах і залатыя каронкі з зубоў расстраляных. Нацыяналісты ўсхвалялі Гітлера і яго «новы парадак». Прадажная «Беларуская газета» пісала: «І вось прыйшлі немцы Адольфа Гітлера! Яны сваім гераічным паходам, нарэшце, прынеслі нам свабоду, аб якой мы летуцелі стагоддзямі».

Нацыяналістычныя арганізацыі ў Беларусі (БНС, БЦР, СБМ, самаахова і інш.) былі створаны гітлераўцамі згодна з планам «Ост». «Мы ў вышэйшай ступені, — гаварылася ў гэтым плане, — зацікаўлены ў тым, каб ні ў якім разе не аб'ядноўваць народы ўсходніх абласцей, а наадварот, дзяліць іх на магчыма больш дробныя галіны і групы».

Узнікшы як вынік плана «Ост», нацыяналістычныя арганізацыі паслядоўна праводзілі яго палітыку. Яны актыўна садзейнічалі ўгону ў Германію беларускай моладзі. Гора і пакуты беларускіх маці ні разу не выклікалі спачування фашысцкіх наймітаў, але са слязамі замілавання яны пісалі аб «сынах нямецкага народа, якія пакінулі свае сем'і, гаспадарку, пакінулі свае варштаты на фабрыках і заводах». І нацыяналісты цынічна заклікалі беларускую моладзь «заняць іхняе месца ў Нямеччыне, каб даць магчымасць нямецкаму жаўнеру аддана несці свой вялікі ўчынак на пазіцыі». 380 тысяч чалавек з дапамогай гэтых здраднікаў былі ўгнаны на катаржныя работы ў Германію.

Так ажыццяўляўся ў Беларусі план «Ост». За тры гады акупацыі з дзесяцімільённага беларускага насельніцтва было знішчана—расстраляна, павешана, спалена жывымі—2 мільёны 200 тысяч чалавек. Няма вобласці, няма раёна на шматпакутнай беларускай зямлі, дзе не пакінулі свой крывавы след фашысты. Няма сям'і, якая б да гэтай пары не аплаквала родных, стаўшых ахвярамі вайны.

У суцэльны канцлагер ператварылі гітлераўцы Мінск і яго ваколіцы: Мінскае гета, лагеры на вуліцы Шырокай і ў Масюкоўшчыне, масавыя расстрэлы ў вёсках Глінішча, Уручча, Дразды. У адным Малым Трасцянцы было расстраляна больш 150 000 чалавек — у асноўным жанчын, дзяцей і старых.

Мінчанка Славінская, цудам застаўшаяся ў жывых, расказвае, як ажыццяўлялася знішчэнне вязняў у Трасцянцы:

«Па камандзе нямецкіх катаў жанчыны па чатыры выходзілі з машыны, узлазілі на верх складзеных трупаў, дзе іх і расстрэльвалі... Мы таксама вышлі з машыны, узлезлі на трупы, і нас пачалі расстрэльваць. Параненая, я працягвала ляжаць на трупах да позняга вечара. Нямецкія каты ў гэты дзень прывезлі ў свіран яшчэ дзве машыны з жанчынамі, якія былі расстраляны на маіх вачах. Акрамя таго, там жа былі і дзеці. Прычым пасля кожнага прывозу вязняў і іх расстрэлу на трупы немцы клалі дровы, а затым пад вечар, абліўшы дровы бензінам, падпалілі свіран гранатамі». Попел спаленых у Трасцянцы раскідваўся па палях падсобнай гаспадаркі, якая належала нямецкай паліцыі.

Больш 22 тысяч чалавек было знішчана ў Калдычоўскім лагеры смерці пад Баранавічамі. Сумную вядомасць набылі канцлагеры ў Азарычах, Дамачове, Арэхах, Васілевічах. І тут асноўнымі ахвярамі фашыстаў былі безабаронныя старыя і маці з дзецьмі. У гэтых лагерах нацысты нават не абцяжарвалі сябе будаўніцтвам крэмацыйных печаў і іншых сродкаў знішчэння. Людзі тысячамі гінулі ад голаду і холаду — іх зусім не кармілі і трымалі на марозе. Пры адступленні нямецкіх войск астаўшыхся ў жывых вязняў наўмысна заражалі тыфусам, каб у часцях Савецкай Арміі ўспыхвалі эпідэміі.

Захаваліся жудасныя здымкі Азарычскага лагера смерці: закачанелыя на марозе трупы дзяцей. Наогул, лёсу дзяцей у плане «Ост» была ўдзелена асобая ўвага: «Не дапускаць барацьбы за зніжэнне смяротнасці дзяцей, не дазваляць навучэнне маці догляду грудных дзяцей і прафілактычным мерам супраць дзіцячых хвароб... Не аказваць ніякай падтрымкі дзіцячым садам і іншым падобным установам».

Падтрымкі! У знясіленых выхаванцаў Мінскага дзіцячага дома была выкачана кроў для параненых фашыстаў, а паміраючых дзяцей кінулі на волю лёсу. Акупанты асіраацілі сотні тысяч дзяцей, пакінулі іх без даху над галавой. Яны туліліся ў руінах, жылі жабрацтвам. 27 верасня 1942 года эсэсаўцы наладзілі ў Мінску аблаву на бяздомных дзяцей. У раёне вакзала было вылаўлена 100 падлеткаў. Усе яны былі расстраляны.

Фашысты знішчалі беларускіх дзяцей, знішчалі будучыню народа, асуджалі яго на выміранне.

Жудасную памяць у народзе пакінулі карныя экспедыцыі. Нявіннымі назвамі «Лясная зіма», «Стракаты дзяцел», «Берта» маскіраваліся акцыі па знішчэнню беларускіх вёсак. Праводзіліся яны планамерна. Намячалася чарговая вёска і з раніцы з усіх бакоў шчыльна ачаплялася атрадамі СС. Жыхары знішчаліся поўнасцю, маёмасць і жывёлу каты забіралі з сабой. Прычым з усіх спосабаў знішчэння людзей па душы фашысцкім садыстам было спальванне жывымі ў хатах і царквах. Баравіно, Краснае, Байкі, Дулебы, Касцюковічы — не пералічыць усіх вёсак, жыхары якіх загінулі страшнай смерцю.

Але беларускі народ не стаў на калені. Не страх і пакорнасць, а ўсенародная партызанская вайна была адказам на зверствы акупантаў. 370 тысяч беларускіх партызан нанеслі гітлераўскай арміі большы ўрон, чым усе саюзныя арміі на так званым другім фронце. Партызаны бязлітасна знішчалі фашысцкіх стаўленікаў у Беларусі. Рука народнай адплаты насцігла здраднікаў Акінчыца, рэдактара «Беларускай газеты» Казлоўскага, старшыню гарадской мінскай управы Іваноўскага. Быў забіты ў Мінску намеснік Гітлера ў Беларусі гауляйтэр Кубэ.

Беларускія нацыяналісты выдалі спецыяльны жалобны нумар сваёй бруднай газеткі ў сувязі са смерцю обер-ката. «У васобе нябожчыка беларускі народ страціў свайго найлепшага прыяцеля», — бессаромна пісалі яны. Але яны «забыліся» адзначыць, што другі «найлепшы прыяцель» беларусаў фон Готберг за Кубэ расстраляў 2 000 заложнікаў і яшчэ больш адправіў у канцлагеры.

А колькі савецкіх грамадзян было замучана ў шталагах — лагерах для ваеннапалонных у Магілёве, Масюкоўшчыне, Бабруйску, Полацку, Асіповічах. Для кандыдатаў у смертнікі не хапала месца ў лагерах. Таму палонных перавозілі з лагера ў лагер у зімовыя сцюжы на чыгуначных платформах. К месцу прыбывалі акачанелыя трупы і іх проста скідвалі пад адхон.

Так здзяйсняўся «новы парадак», які ўсхвалялі ў сваіх газетах нацыяналісты.

...Цвітуць сады ў Баравіно, пасылаюць людзям святло Васілевіцкая і Бярозаўская электрастанцыі, не вянуць кветкі на брацкіх магілах у Малым Трасцянцы. Беларускі народ заляўіў раны вайны, але мінулае не забыта. Іменна таму так настойліва гучыць голас прадстаўнікоў беларускага народа з трыбун міжнародных арганізацый у абарону міру. Народ, які перанёс столькі жахаў вайны, мае права патрабаваць, каб ніколі не ўзняў галаву фашызм, каб ніколі не мог узнікнуць план, падобны плану «Ост», каб заўсёды быў мір на зямлі.

С. КЛІМКОВІЧ,
Т. РЭУТОВІЧ.





НА ЗДЫМКАХ: так выглядаў цэнтр Мінска і чыгуначны мост праз Бярэзіну ў 1944 г.

УНІЗЕ — раскопкі на месцы расстрэлаў ва Уруччы ля Мінска (1944 г.).

ШУКАЛЬНІКІ СКАРБАЎ І СКАРБЫ

Муляраў з брыгады Івана Мітрафанава цяпер называюць «шукальнікамі золата».

Яны рамантавалі стары асабняк на вуліцы Шчэпкіна ў Маскве. Да рэвалюцыі ён належаў уладальніку мылаварнага завода. Муляры павінны былі абкласці цэглай траншэю для труб паравога ацяплення. Ля самай асновы сцяны коўш экскаватара не змог поўнасцю выбраць зямлю. І Віктар Яфімаў узяў рыдлёўку. Яна ўпёрлася ў нешта цвёрдае.

Віктар нагнуўся і падняў невялікі металічны брусок размерам з калоду карт для гульні.

— Глядзіце, такі маленькі, а важыць добрыя кілаграмы тры. Можа, гэта золата?

Побач з першым бруском Віктар знайшоў яшчэ чатыры. Склаў іх на краі траншэі, а ў абедзены перапынак усё ж вырашыў зайсці да ювеліра.

Калі з аднаго бруска ачысцілі шэраваты налёт, ён заззяў яркім жоўтым колерам. Брускі ўзважылі, у іх аказалася амаль 18 кілаграмаў чырвонага золата.

На другі дзень «цуды» паўтарыліся. На гэты раз ўжо брыгадзір Мітрафанаў убачыў на дне траншэі сярод абломкаў цэглы вялікі паўструхлелы футарал. І вось да пяці зліткаў прыбавіліся дзве пары залатых гадзіннікаў, медальён, залатыя бранзалеты і ланцужкі. Абедзве знаходкі ацэнены ў 18 тысяч 148 рублёў 42 капейкі. Сума ўзнагароды, якая належала знайшоўшым скарб, склала звыш 4 тысяч 500 рублёў — 25 працэнтаў кошту скарба. Па закону ўсе гэтыя грошы павінны быць падзелены паміж Віктарам Яфімавым і Іванам Мітрафанавым. Але ж побач працавалі таварышы — знайсці скарб мог кожны. І будаўнікі падзялілі грошы пароўну.

Другога «шукальніка скарбу» Мікалая Несцярэнку я сустрэў на курсах газазваршчыкаў у вучэбным камбінаце «Галоўмасбуда».

Вясной гэтага года слесар-мантажнік Несцярэнка працаваў на будаўніцтве эксперыментальнага квартала ў раёне Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Ля траншэі для газавых і ваданраводных труб ён знайшоў скрыначку, у якой знаходзілася 311 залатых прадметаў. Скарб ацанілі ў 2 656 рублёў 26 капеек.

— Калі сказалі, што з гэтай сумы я павінен атрымаць 664 рублі, — расказаў Несцярэнка, — я не хацеў браць гэтыя грошы. Я ж іх не зарабіў. Здаць знаходку — абавязак усякага паважаючага сябе чалавека. А мне сказалі: «Па закону — чацвёртая частка кошту твая, і адмаўляцца ты не павінен».

Гэтыя выпадкі не адзінкавыя. Нядаўна жыхар горада Куйбышава Сяргей Салтыкоў знайшоў скарб старадаўніх залатых манет на 645 рублёў. Экскаватаршчык Сяргей Задорын з горада Невеля знайшоў каштоўнасці на суму каля 9 тысяч рублёў. Восенню мінулага года масквіч рабочы Ілья Крапачоў знайшоў 240 залатых пярсцёнкаў, а яго зямляк, чатырнаццацігадовы школьнік Юра Сямёнаў — 33 залатыя манеты дарэвалюцыйнай чаканкі на 197 рублёў 50 капеек...

З усіх канцоў краіны паступаюць у Маскву ад савецкіх людзей паведамленні аб яшчэ не раскрытых скарбах. Часам яны абарачваюцца ў рэальныя каштоўнасці. Паведамленні аб тайных скарбах прыходзяць і з-за мяжы.

У жніўні 1961 года ў пасольства СССР у Парыжы звярнуўся Барыс Шышман, адзін з былых уладальнікаў кансервавай фабрыкі ў Сімферопалі. Ён расказаў, што на тэрыторыі фабрыкі ім былі закапаны зліткі золата і іншыя каштоўнасці. Шышман апісаў месца, дзе шукаць скарб. Вядома, за 40 год многае змянілася на тэрыторыі фабрыкі, якая некалі належала братам Шышман. Але пасля доўгіх пошукаў скарб быў усё ж знойдзены.

На імя Барыса Шышмана ў Парыжы пераведзена 1 686 рублёў 16 капеек.

Пісьмы і заявы пралілі святло на тайны многіх скарбаў. Але ёсць яшчэ тайны, якія чакаюць свайго вырашэння.

Недзе паміж Новасібірскам і Краснаярскам восенню 1919 года калчакавец палкоўнік Швагін і яго памагатыя закапалі ў тайзе каля 50 пудоў золата ў злітках, нарабаванага адміралам Калчаком у казначэйствах сібірскіх гарадоў. Яшчэ не разгадан сакрэт «Маскоўскай здабычы» Напалеона — скарбаў, вывезеных ім у 1812 годзе з рускай сталіцы. Недзе гітлераўцы схавалі вядомы янтарны пакой, украдзены імі з Екацярынінскага палаца пад Ленінградам.

Можна спадзявацца, што многія з гэтых скарбаў будуць знойдзены і вернуты народу.

Алег МАРСКОЎ.
АДН.

Баявая нічыя

— Маэстра, гледачы разышліся, вас больш не патрабуюць.

— А ў вас якая машына была?

На побывку едет...

Отчего у нас в поселке
У девчат переполох?
Кто их поднял спозаранок?
Кто их так встревожить мог?

На побывку едет
Молодой моряк,
Грудь его в медалях,
Ленты в якорях.

За рекой над косогором
Встали девушки гурьбой.
— Здравствуй, — все сказали хором, —
Черноморский наш герой!

Каждой руку жмет он
И глядит в глаза,
А одна смеется:
— Целовать нельзя!

Полегоньку отдыхает
У родителей в дому.

Хором девушки вздыхают:
— Мы не нравимся ему!

Ни при чем наряды,
Ни при чем фасон,
Ни в одну девчонку
Не влюбился он.

Ходит, шутит он со всеми,
Откровенно говорит:
— Как проснусь, тотчас же море
У меня в ушах шумит,

Где под солнцем юга
Ширь безбрежная,
Ждет меня подруга
Нежная!

Слова В. БОКОВА
Музыка А. АВЕРКИНА



Спорт

ВЫДАТНЫ ПАЧАТАК

У далёкую Мексіку выехала зборная футбольных клубаў Масквы. Савецкія спартсмены прымаюць удзел у міжнародным футбольным турніры разам з мацнейшымі клубамі Мексікі, Бразіліі і югаслаўскай камандай «Партызан».

Свой першы матч у гэтых спаборніцтвах зборная клубаў Масквы правяла з камандай «Амерыка» — другім прызёрам чэмпіянату Мексікі. Сустрэча закончылася пераканаўчай перамогай зборнай клубаў Масквы з лікам 5 : 0.

БЕЛАРУСЬ—ВЕНГРЫЯ

Вялікую цікавасць у аматараў класічнай барацьбы выклікала міжнародная таварыская сустрэча барцоў Венгрыі і Беларусі, якая днямі адбылася ў Мінску. Барцы Венгерскай Народнай Рэспублікі з'яўляюцца аднымі з мацнейшых у свеце. На апошнім першынстве свету 1963 года яны занялі другое месца, прапусціўшы наперад толькі зборную каманду Савецкага Саюза. Але і беларускія барцы добра зарэкамендавалі сябе на першынствах СССР і буйнейшых міжнародных спаборніцтвах. 4,5 : 3,5 у карысць зборнай Беларусі — так закончылася гэта сяброўская сустрэча.



НА ЗДЫМКУ: момант барацьбы. На дыване беларускі барэц Генадзь Суднікаў і венгр Пояк Імрэ.

Фота Ул. Кітаса.

НАСТАЎНІК-ПАЭТ

Захар Якаўлевіч Бірала працуе выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Мар'інагорскай сярэдняй школе. Але ён не толькі педагог. Яго вершы і байкі часта друкуюцца на старонках газет і часопісаў рэспублікі.

Першы зборнік вершаў «Смех і радасць вёскі» паэт выдаў у 1929 годзе пад псеўданімам Захар Бульбянік. Як каштоўную рэліквію беражэ яго Захар Якаўлевіч. А гэтымі днямі да яго прыбавіўся яшчэ адзін. Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла ў свет кнігу вершаў для дзяцей «Цвітуць кветкі».

Цяпер З. Я. Бірала працуе над новым зборнікам, які выйдзе ў свет у гэтым годзе пад назвай «Калгасныя весялушкі».

Настаўнік-паэт з'яўляецца старшынёй літаратурнага аб'яднання, кіруе літаратурным гуртком у Мар'інагорскім тэхнікуме, часта чытае свае вершы па мясцовым радыё, на сходах моладзі, за што Захара Якаўлевіча і паважаюць працоўныя раёна.

М. МОТУЗ.

Эфір

ДЛЯ ЗАХОДНЯЙ ЕУРОПЫ

Слухайце штодзённа нашы радыёперадачы па сярэднееўрапейскаму часу: ад 7 да 8 гадзін, ад 15 да 16, ад 17 да 20 і ад 21 да 22 гадзін у дыяпазоне наступных каротніх хваль: 16, 19, 31, 41 метр, а таксама на сярэдніх хвалях 216,6 і 375 метраў.

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ — на гэтых жа хвалях па суботах ад 7 гадзін 30 мінут да 8 гадзін і ад 19 гадзін 30 мінут да 20 гадзін па сярэднееўрапейскаму часу.

Апрача таго, штодзённа на каротніх хвалях 50,25 і 50,51 метра ад 22 гадзін 30 мінут да 23 гадзін 30 мінут па сярэднееўрапейскаму часу.

ДЛЯ ЗША, КАНАДЫ І КРАІН ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ

Слухайце штодзённа нашы радыёперадачы па нью-йоркскаму часу ад 18 гадзін 30 мінут да 20 гадзін 30 мінут у дыяпазоне наступных каротніх хваль: 19, 25, 31 і 41 метр, а таксама на сярэдняй хвалі 216,6 метра.

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ — на гэтых жа хвалях кожную суботу ад 19 гадзін да 19 гадзін 30 мінут па нью-йоркскаму часу.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.

НАШ АДРАС
Мінск, Ленінскі праспект, 77, Дом друку. Рэдакцыя газеты «Голас Радзімы».